(бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 26 1933 г. № 139 (4583)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Учора адкрылася Ўсебеларуская нарада рэдактароў газэт

Учора 25/VI у памяшканьні ЦК КП(б)Б пачала сваю работу склікана культпропам ЦК КП(б)Б Усебеларуская нарада рэдактароў цэнтральных, раённых, фабрычна-заводзкіх і палітаддзельскіх газэт.

Нарада адкрылася уступнай прамовай сакратара ЦК КП(б)Б В. Ф. ШАРАНГОВІЧА. Учора нарада заслухала даклад тав. БЭНЗКА на тэму «Пытаньні праполкі, уборкі, перашачарговай здачы дзяржаве збожжа і задачы друку».

На нарадзе прысутнічае звыш 100 чалавек.

Разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва за пяршынства ва ўборцы ўраджаю і пастаўцы сельгаспрадуктаў дзяржаве

СМАЛЕНСК, АБКАМПАРТ—РУМЯНЦАВУ АБЛВЫКАНКОМ—РАКІТАВУ

Шлём бальшавіцкае прывітаньне партыйнай і камсамольскай арганізацыі, калгасьнікам і ўсім працоўным Заходняй вобласьці. Сацыялістычнае спаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласьцю зьявілася мацнейшым вагаром у барацьбе за тэмпы і якасьць у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы.

Ня гледзячы на тое, што за БССР у спаборніцтве па сяўбе з Заходняй вобласьцю засталося пяршынства і яна закончыла ў гэтым годзе сяўбу на 20 дзён раней мінулага году, адзначаем, што мы далёка ня вытрымалі ўстаноўленых партыяй і ўрадам тэрмінаў сяўбы як па ўсіх культурах у цэлым, так і асабліва па аўсу і ільну.

Партарганізацыі, саветы, калгасьнікі Заходняй вобласьці паказалі прыклад сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за сваячасовае сканчэньне пасеваў ільну, апярэдзіўшы БССР.

Прымаем вашу прапанову аб прадаўжэньні дагавору па сацспаборніцтву за пяршынства ва ўборцы новага ўраджаю і першачарговым датэрміновым выкананьні абавязацельстваў перад дзяржавай, за ажыцьцяўленьне лёзунгу правадыра нашай партыі тав. Сталіна — зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Абавязацельствы, якія выцякаюць з прадаўжэньня дагавору, ставім на шырокае абмеркаваньне. Мабілізуем кожны саўгас, калгас, сельсавет, працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за сацыялістычнае пяршынства.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Да ўсіх калгасаў БССР і Заходняй вобласьці, да ўсіх працоўных аднаасобнікаў!

Ліст калгасьнікаў калгасу „Новае жыцьцё“ са Случчыны

Слуцкі раён, уступіўшы ў спаборніцтва на лепшае правядзеньне сяўбы, з першых-жа дзён разгарнуў высокія тэмпы барацьбы за якаснае і колькаснае выкананьне плянаў веснавой пасеўнай кампаніі. Наш раён першым у БССР выканаў план веснавой сяўбы, за што ўзнагароджан Чырвоным сьцягам ЦК і СНК. А наш калгас першым у раёне засеяў увесь яравы клін. Мы пачалі сеяць як толькі зышоў сьнег. Працавалі ад цямна да цямна, а ў апошнія дні барацьбы за пераходны сьцяг мы ўзвысцярылі тэмпы і працавалі пры месяцы, затое і першымі ў раёне скончылі сяўбу.

ЯК МЫ АДСЕЯЛІСЯ РАНЕЙ НА ЦЭЛЫ МЕСЯЦ

У мінулым годзе сяўба ў нас запягнулася да 15 чэрвеня, хоць надвор'е было добрым, а сёлета доўгі час ішлі дажджы, стаялі халады і тым ня менш мы **АДСЕЯЛІСЯ РАНЕЙ НА ЦЭЛЫ МЕСЯЦ.** Упяршыню правялі мы масавую звышпраньнюю сяўбу. **УСХОДЫ НА НАШЫХ ПАЛЁХ ВЕЛЬМІ ДОБРЫЯ; НЕ ПАЗНАЕШ, ДЗЕ АЗІМЫЯ, А ДЗЕ ЗВЫШРАНЬНІЯ.** Густыя ўсходы, высокія, аж вока радуецца. Летась мы сабралі 42 пуды азімых з га, яравых — 32 пуды, а сёлета мы ўпэўнены, што зьбярэм ня менш як 63 пуды з га азімых, а такой культуры, як ячмень, мы атрымаем ня менш 70 пудоў.

А чаму гэта так? Чаму нам удалося адсеяцца ў больш кароткі тэрмін і дасягнуць высокай якасьці? Гаспадарамі мы сталі — вось што. **САПРАЎДНЫМІ ГАСПАДАРАМІ СВАЁЙ ПРАЦЫ,** інакш працаваць пачалі. Зразумелі, што ўсё залежыць ад нас саміх, што калгас — гэта мы самі. Навучыліся мы лепш, больш арганізавана працаваць. У мінулую вясну ў бядатках была дакучасьць, ніхто ня ведаў, што ён заўтра будзе рабіць, брыгадзіры да поўдня хадзілі пад вокнамі, зьбіралі людзей на працу. Працавалі гуртам, цяпер праца ішла інакш. Брыгады умацаваліся, у кожнай свой плян, свой вучастак, свае сталыя людзі, дый брыгадзіры напрактыкаваліся. Аралі, сеялі зьвенымі. Улічвалі і правяралі работу. Зусім іншымі сталі адносіны калгасьнікаў да працы. Калгасьнік зразумеў, што «маё — гэта калгаснае». Ня прыходзіцца людзей зараз прасіць на працу, самі выходзілі. Зразумелі, што калі працаваць ня будуць, дык нічога не атрымаюць. Дарма ніхто нічога ня дасьць. Па галоўцы гультая мы ня гладзім. Не «работа дурня любіць», а наадварот, не папрацуеш — дурнем застанешся. Калгас, як кацёл, пераварваў, перарабляў людзей.

А супроць упартых лодыраў мы меры ўжывалі: выключалі з калгасу, жартаваць ня думалі. Возьмеце такіх гультаёў, як Малышаў Іван, Бартош Пятро, Краўчэня Іван. Гэтых лодыраў мы прагналі, як дапаможнікаў клясавых ворагаў, якія перашкаджаюць працаваць.

А якасьць палявых работ? Кожнаму, хто пабываў на нашых палёх, кідаецца ў вочы глыбокая розьніца паміж сёлетнім і летапшнім годам. Зааралі мы лепш, глыбінёй у 18 сантымэтраў. Не дапусьцілі ні аднаго агрэху. Прымалі работу па правілах. Заўважалі агрэх, нягыбкае ворыва, няпоўныя нормы высеву—калі ласка, перарабляй работу, ды яшчэ штраф плаці. І недарма зямля ў нас як пух. Узаемаправерка сацспаборніцтва — вось што асабліва дапамагло нам. Брыгады правяралі адна другую. Спаборнічалі актыўна, пераганялі адна адну, правяралі кожную дробязь у рабоце.

У прыёмцы актыўны ўдзел прынялі вопытныя старыя калгасьнікі, яны давалі ацэнку. Есьць у нас вучасткі, дзе зямля была заліта вадой. Папрабуй сеяць. Дружна капалі канавы, адводзілі ваду, а потым сеялі.

Нашы перамогі ў сяўбе арганізаваны бальшавікамі. Яны паказалі нам шлях да культурнага і заможнага жыцьця. Яны дапамагалі нам зжываць дробнабуржуазныя звычаі, дапамагалі ламаць супраціўленьне кулака. Не ўдалося кулаччу сарваць сяўбу. Выкінулі мы іх з калгасу. Мы выгналі з нашых радоў шмат кулакоў, у ліку якіх такія заядлыя, як Гурбо Трафім, Гурбо Аляксей, Гурбо Міхась. Гэтая кулацкая зграя імк нулася разваліць калгас з сярэдзіны. Гэта яны агітавалі за нявыхад на работу, кажучы: «Вы пасееце і пажнеце, а есьці ня будзеце».

Словы тав. Сталіна — «каб стаць заможнымі, зрабіць калгасы бальшавіцкімі, трэба толькі адно — працаваць сумленна, дзяліць калгаснае дабро па працы, берагчы калгаснае дабро, выканаць заданьні ўраду, выкінуць кулака», — гэтыя простыя ясныя словы зрабіліся нашай праграмай.

Мы добра памятаем, што сяўба — гэта толькі пачатак справы, менш паловы яе. Для таго, каб дабіцца высокага ўраджаю, трэба замацаваць вынікі сяўбы добрым поліваем, добрай уборкай, аховай ураджаю, абмалотам і правільным разьмеркаваньнем ураджаю, сваячасовым правядзеньнем збожжапаставак.

НІ АДНАГО ГЭКТАРА ПУСТАЗЕЛЬЛЮ

Кожнаму вядома, што пустазельле зьніжае ўраджай, заглушае ўсходы. Усе палі трэба ачысьціць ад пустазельля. Інакш і ня думай аб высокім ураджаі.

Мала аднаго, трэба два разы прапалоць, трэба вытрушыць пустазельле з поля таксама, як вытручваюць шкодніка і кулака з калгасу. Мы яшчэ з вясны вызначылі два разы прапалоць збожжавыя і лён, тры разы гароды, два разы зрабіць акучку бульбы. У выкананьне гэтага мы прапалолі ўжо ўвесь авёс, ячмень, гарох, лён, пшаніцу, жыта, віку ў ліку 380 гэктараў. Мы ўжо па другім разе праполваем яравыя. Мы пачалі ўжо таксама і 30-га канчаем па першым разе акучку бульбы. Тут-жа пасьля акучкі выкараняем пустазельле — бараную. Адказнасьць за кожны вучастак ўсклалі на старшых брыгадзіраў. Рабочая сіла ў нашых брыгадах разьбіта на пяць зьвеньняў і кожнае з іх адказвае за якасьць поліва.

Мы выклікаем на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні поліва ўсе калгасы, усіх калгасьнікаў БССР і Заходняй вобласьці. Выходзьце на барацьбу з пустазельлем, не пакінеце неапышчаным ні аднаго вучастку зямлі. Няхай кожны калгасьнік, рабочы саўгасу, МТС, кожная дзесяцідворка аднаасобнікаў яшчэ шырэй разгорнуць сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай.

Апрацоўваць зямлю — гэта нялёгкая справа. «Узарэш папар у маі — будзеш з ураджаем», — гаворыць прыказка.

АБ НАШЫХ АБАВЯЗКАХ ПА ЎБОРЦЫ

У нас увесь папарны клін засеян. Каб пашырыць калгасную заямельную плошчу, каб даць яшчэ больш ураджай і даход калгасьніку, мы пачалі вышукваць дадатковыя вучасткі. Мы зараз узьнялі цаліну, якая вякамі пуставала, на якой нават трава не расла. Мы ўпэўнены, што гэта зямля — а мы яе добра апрацуем — у будучым дасьць добры ўраджай. Мы зараз яе дыскуем і яшчэ раз пераворваем. Мы паставілі сабе задачу ўвесь азімы клін сёлета засеяць толькі на сьвежа ўгноенай зямлі. Для гэтага мы прывезьлі 14 тон угнаеньня і мяркуем вывезьці 1.500 вазоў гною, 1.000 вазоў торфу. Апрача таго, мы яшчэ вясной выдалі кожнаму калгасьніку звыш працадзён саломы для падсыпцілу сваёй неабгуленай жывёлы. Гэтыя калгасьнікі нам рыхтуюць для азімых гной. Такім чынам мы разьлічваем сабрацца па дварох калгасьнікаў ня менш 800 вазоў гною. **НАШ ЛЁЗУНГ—АЗІМЫЯ ЗАСЕЕМ НА СЬВЕЖЫМ УГНАЕНЬНІ.**

Хутка наступіць уборка. Усё залежыць ад яе. Убіраць нам прыдзецца 360 га збожжа і 340 га сенажаці і ўкосная канюшыны. Плошча немалая. Ня даць збожжу перастаяць, асыпацца, для гэтага як мага больш скараціць тэрміны ўборкі — наша задача. Мы разумеем, што значыць з'эканоміць на жніве 5-7 дзён. Гэта значыць зьберагчы збожжа ад псаваньня, а раскрадваньня.

Мы не дапусьцім і марнай траты часу на сенаўборцы. Згубіць тут два-тры дні — гэта значыць патнаіць сена, падарваць кармовую базу сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Мы ўжо прыступілі да касьбы. Скасілі на 20 чэрвеня 30 га сена. За 14 дзён мы поўнасьцю скончым сенаўборку, г. зн. 6 ліпеня поўнасьцю канчаем з сенам.

Мы абавязваемся ўбраць збожжа ня больш, як за 10 дзён. Мы падрыхтавалі ўжо нашы жнявяркі, а ў нас іх 4. Да кожнай машыны прымацоўваны сталы машыніст. Вызначаны спэцыяльныя коні, якія пастаўлены ў лепшыя ўмовы. Кожная жнявярка будзе ў нас працаваць ад расы да расы пры дзьвюх зьменах коняй. Нормы выпрацоўкі — ня менш 5 гэктараў на жнявярку. Да кожнай жнявяркі прымацавана па 8 жанчын, якія тут-жа, сьледам за жнявяркай, будуць зьвязваць снапы. Мы ведаем, што толькі працай машын і жанчын мы ўраджай не зьбярэм. Таму мы вызначылі максымальна выкарыстаць на ўборцы ў якасьці жалцоў і мужчын.

МЫ ЗАКЛІКАЕМ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ СВАЯЧАСОВА ПАЧАЦЬ УБОРКУ І КАСЬБУ, ЗАБЫЦЬ ПРА СТАРУЮ ДЗЕДАЎСКУЮ ТРАДЫЦЫЮ — ПАЧАЦЬ РАБОТЫ ПАСЬЛЯ «ПЯТРА» І «ПРАЧЫСТАЙ», ПРАВЕСЬЦІ ЎБОРКУ І СЕНАКОС У САМЫ КАРОТКІ ТЭРМІН. НІ АДНАГО ПРАТЭРМІНАВАНАГА ДНЯ!

Ліквідаваўшы абязьлічку, мы дабіліся таго, што наш транспарт і інвэнтар вышлі з пасеўнай у спраўным стане. За раз нашы члены праўленьня разам з брыгадзірамі правялі праверку ўсяго інвэнтару, усёй цягавай сілы, якія пераданы брыгадам у спраўнасьці. Увесь інвэнтар адрамантаван да ўборачнай і прынят па акту кожнай брыгадай. Мы можам зараз сьмела сказаць, што мы поўнасьцю гатовы сустрэць уборку.

Мы заклікаем вас напружыць усе сілы, каб скончыць падрыхтоўку, каб у часе жніва і касьбы ня было ніякіх замінак.

НАШ ЛЁЗУНГ — САБРАЦЬ УСЁ ЗБОЖЖА І СЕНА ПОЎНАСЬЦЮ ДА АДНАГО ЗЕРНЯ, ДА АДНЭЙ ТРАВІНКІ. БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ, З РАСКРАДАНЬНЕМ — НАША КРОЎНАЯ СПРАВА. Есьць ахвотнікі пакарыстацца нашым дабром. Мы ўжо не гаворым аб кулаку, які ўсю сваю злосьць імкнецца сарваць на нас. Лодыр таксама, хоча ўкрасьці збожжа і сена, каб потым спакойна ляжаць на печы. Трэба пільна берагчы калгасны ўраджай. Калі кожны калгасьнік будзе ахоўваць збожжа і стагі сена, дык злодзеям дрэнна прыдзецца.

ЗАХАВАЦЬ КОЖНЫ КОЛАС

Як толькі зьявіліся першыя ўсходы, мы паставілі вартавых. Калі збожжа стане сьпелым — мы павялічым яшчэ варту. Будзем рабіць сутачныя аб'езды апрача вартавых.

МАЛА ГЭТАГА. НАМ ТРЭБА ЧЫСТА ЖАЦЬ. УСЁ ЗБОЖЖА ВЯЗАЦЬ У СНАПЫ. ТРЭБА ТАК ПАСТАВІЦЬ РАБОТУ, КАБ АДНАЧАСОВА СА ЖНІВОМ ПАЧАЦЬ МАЛАЦЬБУ, КАБ МАЛАТАРНІ НЕ МАЎЧАЛІ НІ АДНЭЙ ГАДЗІНЫ.

Нямала збожжа траціцца пры малацьбе. Каб ня было гэтага, мы павінны ўстанавіць кантроль над малатарнямі, ссыпаць збожжа ў сьвіран, ня трымаць яго пад адкрытым небам, здаваць збожжа ў сьвіран праверанай вагой, каб не дапусьціць раскрадваньня

Каб не пакінуць ні аднаго коласу ў поле, мы мабілізуем піянэраў і школьнікаў на збор калосьсяў. Для барацьбы са стратамі збожжа мы пачынаем уборку не па меры пасьпяваньня ўсёй плошчы тэй ці іншай культуры, а будзем убіраць асобнымі высьпеўшымі вучасткамі, незалежна ад іх разьмераў. Мы ўстанаўляем па два зерняўлоўнікі да кожнай жнявяркі і вызначаем кожнай брыгадзе спэцыяльных грабцоў па зграбаньні калосьсяў (а грабляў мы нарабілі даволі).

Мы падрыхтавалі ўжо з леташняй абмалочанай саломы пярэвяслы для зьвязваньня снапоў, — гэта дасьць вялікую эканомію працы і зерня. Асабліва вялікая страта зерня атрымліваецца пры перавозцы снапоў з поля. Для гэтага мы абіваем усе нашы вазы посьцілкамі, а ўкладку снапоў мы робім такім чынам, каб калосьсе было ўнутры воза.

ЗАКЛІКАЕМ І ВАС, ТАВАРЫШЫ, АБВЯСЬЦІЦЬ ВАЙНУ СТРАТАМ УРАДЖАЮ.

ЗДАЦЬ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ З ПЕРШАГА-Ж АБМАЛОТУ

НАШ ПЕРШЫ АБАВЯЗАК—ЗДАЦЬ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ, НАШАЙ РОДНАЙ ДЗЯРЖАВЕ. З гонарам выканаем сваё абавязацельства! Вывяз збожжа пачнем з першым абмалотам. Для падсушкі снапоў мы ўстанаўляем па больш 5-ці дзён, пасьля чаго снапы будзем звозіць у гумно і тут-жа спэцыяльна вылучаныя брыгады па 21 чал. на малатарню прыступаюць да абмалоту. Будзем малаціць у дзьве зьмены, прычым у суткі гэтыя брыгады абмалоцяць 800 пудоў. Мы паставілі сабе мэтай пры малацьбе захаваць кожнае зерня. Кожны ведае, што з малатарні ў амецьце пападае шмат зерня. **Пераварфаваць на сартыроўцы ўсё амецьце — і зерня будзе наша. УСТАНОЎЛЕНЫ ПЛЯН ПАСТАЎКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ БУДЗЕ ВЫКАНАН ЗА ЧАТЫРЫ ДНІ. МЫ Ў КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ ВЫЛУЧЫЛІ СПЭЦЫЯЛЬНАЕ ЗЬВЯНО ПА ВЫВАЗЦЫ ЗБОЖЖА** на прыстанцыйныя пункты. Мы добра ведаем, што кожная наша капейка, кожны пуд хлеба ідзе ня ў кішэню капіталіста, а на карысьць усіх працоўных, на пабудову сацыялізму. І таму мы абавязваемся да 25 жніўня скончыць здачу збожжа дзяржаве, а потым прыступіць да ссыпкі фондаў і разьмеркаваньня па працаднёх. Здачу бульбы мы абавязваемся скончыць да 20 верасьня.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ВЫ, ТАВАРЫШЫ КАЛГАСЬНІКІ, ПАДХОПІЦЕ ГЭТЫ НАШ ЛЁЗУНГ.

Памятайце, посьпех нашай работы — у правільнай арганізацыі працы, у моцнай дысцыпліне, клясавай пільнасьці. Перамога сама ў рукі не даецца, яе трэба заваяваць у барацьбе з клясавым ворагам, з лодырам і гультаём.

Ад умелай арганізацыі людзей шмат чаго залежыць. Кожны павінен ведаць сваё месца ў брыгадзе. Работа кожнага павінна быць на віду ва ўсіх. Патрэбен суровы кантроль над якасьцю працы. Нельга пакрываць памылкі і нядобрасумленную працу. Трэба ў сацспаборніцтва ўцягнуць усе брыгады, усіх калгасьнікаў. Штодзённа брыгада павінна ведаць вынікі работы на кожным вучастку. Вялікую карысьць дасьць работа інспэкцый па якасьці, якія працавалі ў нас вясной, а таксама аграўпаўнаважаных.

Для нас заможнае жыцьцё — ня мара. Гэта — наша рэальная задача. Калі мы добра зьбярэм ураджай, дык пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай і ссыпкі фондаў кожны добрасумленны калгасьнік атрымае ня менш 70 пудоў збожжа не гаворачы ўжо аб іншых культурах і грошах.

Мы першымі скончылі сяўбу. Мы былі ў першых радах барацьбітоў за ганаровы чырвоны сьцяг ЦК і СНК Беларусі. Будзем першымі на поліву, уборцы і здачы збожжа, будзем і ў далейшым змагацца, каб утрымаць за раёнам ганаровае імя чырвонасьцяжнікаў.

Мы разгарнулі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшае правядзеньне праполкі, уборкі і здачу прадукцыі дзяржаве паміж зьвеньнямі, брыгадамі, мы спаборнічаем з калгасам «Памяць Ільліча», **МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ЎСЕ КАЛГАСЫ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ ВОЗЬМУЦЬ З НАС ПРЫКЛАД І РАЗГОРНУЦЬ САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРКІ, МАЛАЦЬБЫ І ЗДАЧУ ПРАДУКЦЫІ.**

Мы просім рэдакцыю газэты «Зьвязда» быць арбітрам усебеларускага сацспаборніцтва.

НАПЕРАД, ЗА ВЫКАНАНЬНЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ, ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ!

Па даручэньні калгасьнікаў:

С.-г. арцель «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ»
Случчыны, І. Гародзінскі сельсавет.
Чэрвень 1933 г.

ПЕРШАЯ ЗАПАВЕДЗЬ—ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Высокія, густыя палеткі жыта, дружныя ўсходы аўса, ільну, роўныя рады бульбы на пераважнай большасьці нашых палёў зьяўляюцца рэзультатам правільнай бальшавіцкай арганізацыі сяўбы.

Аднак, ураджаем нельга пічыць тоўсты, што вырасла на палёх. Ураджаем пічыцца тое, што ўбрана з поля. **УДАРНА ЗАСЕЯНЫЯ ПАЛІ ПАВІННЫ ДАЦЬ ЯК МАГА БОЛЬШ ПРАДУКЦЫІ.** Трэба рушыць калгасныя масы на ахову пасеваў ад пустазельля, шкоднікаў і раскрадальнікаў, на барацьбу са стратамі пры ўборцы, **НА ПЕРШАЧАРГОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.**

У ланцугу гэтых работ **ЗБОЖЖАЗДАЧА** займае самае галоўнае, рашаючае месца.

Нельга забыць тое, што многія арганізацыі зацягнулі ў мінулым годзе выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, што клясаваму ворагу з-за адсутнасьці рэвалюцыйнай пільнасьці ў радзе месц удалося працягнуць антыдзяржаўныя тэндэнцыі. Мы павінны ўважліва ацаніць тыя асаблівасьці, якія адрозьніваюць гэты год ад мінулых. У пастановах ЦК і СНК гэтыя асаблівасьці сфармуляваны з поўнай ясьнасьцю.

Якія-ж гэта асаблівасьці? Бясспрэчна адно, што больш дружнае і раньняе правядзеньне сяўбы і лепшая якасьць апрацоўкі палёў стваралі спрыяючыя ўмовы і для ўборкі і збожжаздачы гэтага году. У гэтым першая асаблівасьць тэй абстаноўкі, у якой будуць працаваць у гэтым годзе ўборка, абмалот і збожжаздача дзяржаве.

У гэтым годзе мы маем цьвёрды непарушны закон аб збожжапастаўках. Гэты закон адрозьніваецца ад збожжазагатовак старога тыпу, якія праводзіліся на аснове ня зусім поўных кантрактацыйных дагавораў з сялянствам. Гэты закон, які мае сілу падатку, ня можа быць парушан. **ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО НІЯКІЯ АДХІЛЕНЬНІ АД АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА Ў ТЭРМІН НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАПУШЧАНЫ.**

Ярким пацьвярджэньнем пераваг гэтага закону зьяўляецца той працоўны ўздым калгасьнікаў, які выклікан ім на весьнавой сяўбе гэтага году. Асаблівасьць гэтага закону заключаецца яшчэ ў тым, што калгасьнікі і аднаасобнікі маюць магчымасьць цьвёрда разьлічваць свае даходы. Гэта яшчэ больш умацоўвае становішча калгасаў і ўстойлівасьць гаспадаркі. Пераважная большасьць калгасьнікаў зразумела, што гэты закон стаіць на варце інтарэсаў сумленных калгасьнікаў, акуратна выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай.

«... Вопыт збожжазагатовак гаворыць, што іменна першыя тры месяцы выражаюць пёс заготак, бо тое, што ўпушчана ў гэтыя месяцы, ня можа быць адноўлена на працягу ўсяго збожжазагатоўчага году. Гэта значыць, што пастаўка збожжа дзяржаве павінна быць разгорнута з першых-жа дзён абмалоту, а калгасны гандаль павінен быць прыпынен з першых-жа дзён збожжазагатовак» (з пастановы ЦК і СНК СССР).

Ці маем мы магчымасьць з першых-жа дзён абмалоту, а правільней АДНАЧАСОВА З АБМАЛОТАМ разгарнуць збожжаздачу? Бязумоўна, маем. Мы значна ўмацавалі нашы пазыцыі на сяле. Мы стварылі палітаддзелы ў МТС і саўгасах. Мы ўкамплектавалі гэтыя палітаддзелы высокакваліфікаванымі, вытрыманымі, праверанымі партыйна-палітычнымі кадрамі. Нікому зараз не сакрэт, што палітаддзелы МТС і саўгасаў—гэта найлепшыя магутныя сілы ў нашай барацьбе за далейшы ўздым калгаснай гаспадаркі, што палітаддзелы адыграюць найлепшую ролю ў сваячасовым правядзеньні збожжазагатовак.

Нельга таксама не адзначыць тэй асаблівасьці збожжаздачы, што за апошні год значна пашырана мэханічная база сельскай гаспадаркі—трактары, аўтамашыны і г. д.

Самая выдатная асаблівасьць збожжазагатовак гэтага году—гэта **ЎЗРОСШАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ КАЛГАСЬНІКА** ў хутчэйшым і лепшым скончэньні сельска-гаспадарчага году, у тым, што калгасьнік ведае пераваг закону і ўсвоіў лёзунг, даны правадыром партыі тав. Сталіным «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

Яркай ілюстрацыяй высокай сьвядомасьці калгасьнікаў і тых вялізарных магчымасьцяй, якія мы маем у выкананьні збожжазагатовак у максымальна кароткі тэрмін, зьяўляецца адозва ўдарнікаў-калгасьнікаў калгасу «Новае жыцьцё» да ўсіх калгасьнікаў БССР і Заходняй вобласьці, якая сёньня друкуецца. Ударнікі гэтага калгасу шырока абгаварылі на вытворчых нарадах як у брыгадах, так і ў самім калгасе кожны асобны этап работы.

«НАШ ПЕРШЫ АБАВЯЗАК—ДАЦЬ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ, НАШАЙ РОДНАЙ ДЗЯРЖАВЕ—пішуць у сваім пісьце калгасьнікі.—З гонарам выканаем свае абавязацельствы. **ВЫВАЗ ЗБОЖЖА ПАЧНЕМ З ПЕРШЫМ АБМАЛОТАМ. УСТАНОЎЛЕНЫ ПЛЯН ПАСТАЎКІ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ, ПІШУЦЬ ЯНЫ ДАЛЕЙ, БУДЗЕ ВЫКАНАН ЗА ЧАТЫРЫ ДНІ. МЫ Ў КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ ВЫЛУЧЫЛІ СПЭЦЫЯЛЬНАЕ ЗЬВЯНО ПА ВЫВАЗЦЫ ЗБОЖЖА НА ПРЫСТАНЦЫЙНЫЯ ПУНКТЫ. Мы добра ведаем, што кожная наша капейка, кожны пуд хлеба ідзе ня ў кішэню капіталіста, а на карысьць усіх працоўных, на пабудову сацыялізму. І таму МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ ДА 25 ЖНІЎНЯ СКОНЧЫЦЬ ЗДАЧУ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ, А ПОТЫМ ПРЫСТУПІЦЬ ДА ССЫПКІ ФОНДАЎ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ПА ПРАЦАДНЁХ. Здачу бульбы мы абавязаліся скончыць да 20 верасьня.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ВЫ, ТАВАРЫШЫ—КАЛГАСЬНІКІ, ПАДХОПІЦЕ ГЭТЫ НАШ ЛЁЗУНГ».

АДОЗВА КАЛГАСЬНІКАЎ КАЛГАСУ «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» БЯЗУМОЎНА ПАВІННА СТАЦЬ ЗДАБЫТКАМ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ, ЯКАЯ З НАМІ СПАБОРНІЧАЕ. Гэта адозва павінна зьявіцца праграмай баявога дзеяньня ўсіх калгасьнікаў ня толькі ў правядзеньні поліва і ўборкі, але асабліва ў галіне сваячасовай здачы прадукцыі дзяржаве.

Трэба ўжо ў пэрыяд падрыхтоўкі разьбіваць ушчэнт манэўры клясавага ворага, шкодніка, якія прабуюць сарваць збожжаздачу.

Трэба разам з тым рашуча ўдарыць па тых бястурботных настроях, якія яшчэ да гэтага часу пануюць у радзе арганізацый. Партыйныя, савецкія і за гатоўчыя арганізацыі павінны зараз-жа разгарнуць баявую падрыхтоўчую работу да загатовак.

Мы маем яшчэ на сёньня такое ганебнае зьявішча, калі рад раёнаў ня скончылі ўручэньня абавязацельстваў (Віцебск, Асьвея, Чачэрск, Камарын, Лельчыцы, Прапойск і інш. раёны).

Сыстэма Загатзбожжа ў БССР да гэтага часу яшчэ не разгарнула падрыхтоўкі да прыёмкі збожжа. Узятыя тэмпы паказваюць, што яна нават ня будзе гатова да збожжаздачы праз тры месяцы, калі адпаведныя арганізацыі ня прымусяць Загатзбожжа спыніць бясконцыя разважаньні і прыступіць да сапраўднай падрыхтоўкі тэхнічнай базы. Загатзбожжа зусім ня турбуе такое становішча, што зараз на хапае складачных памяшканьняў на 50.000 тон, што ў Парычах, напрыклад, наяўныя складачныя памяшканьні задавальняюць патрэбы толькі на 5 проц., у Суюць патрэбы толькі на 5 проц., у Ружах—на 10 проц., у Брагіне—на 20 проц., у Церахоўцы—на 7 проц.

Рамонт старых і будаўніцтва новых складаў праходзіць выключна дрэнна. Такое пытаньне, як падрыхтоўка і ўкамплектаваньне кадрамі прыёмшчыкаў, каўсіраў, бухгальтароў, таксіроўшчыкаў і інш. работнікаў загатоўчай сыстэмы выпала з поля зроку Загатзбожжа.

Прыёмачныя пункты не забясьпечаны вагамі, гірамі і інш. інвэнтаром.

Выключна вялікую небясьпеку прадстаўляе зараз такая марудная работа, як у Загатзбожжы. Зараз замаруджаньне—найвялікшае злачынства. Папярэдзіць прарывы, перасякаць у корані ўсякія спробы сарваць сваячасовую здачу збожжа дзяржаве—такава баявая задача партыйных і савецкіх арганізацый.

На райкомы партыі, на кожную партыйную ячэйку, на савецкія органы ўскладаецца поўная адказнасьць за пра дугледжаньне ўсіх «дробязяй»—падрыхтоўку транспарту, плянаваньне перавозак, падрыхтоўку элеватараў, складаў і г. д. Неабходна зараз-жа правесьць, як падрыхтавана бесьпярэбойная прыёмка збожжа ад здатчыкаў і г. д.

«Зрабіць гэты год апошнім годам труднасьцяй—гэта такая задача, такая пэрспэктыва, якая выклікае і ня можа не выклікаць у кожнага бальшавіка, у кожнага перадавіка—беспартыйнага актывіста, рабочага і калгасьніка—новы прыліў энэргіі, бадзёрасьці ў барацьбе, упэўненасьці ў перамозе, гатоўнасьці пакласьці ўсе свае сілы на выкананьне гэтай задачы з тым, каб у далейшым рушыцца наперад з яшчэ большымі посьпехамі, меншымі труднасьцямі, больш высокімі тэмпамі ўперад, да канчатковай і поўнай перамогі» (ПОСТЫШАЎ).

НЯ ПРЫХОДЗІЦЦА СУМНЯВАЦЦА, ШТО БАЛЬШАВІКІ БССР ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б, ЗАНЯЎШЫ ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў СПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ ПА СЯЎБЕ, НЕ ЗДАДУЦЬ ЗАВАЯВАНЫХ ПАЗЫЦЫЙ І БУДУЦЬ ІСЬЦІ Ў ПЕРШЫХ РАДОХ У ПРАПОЛЦЫ, ВОРЫВЕ ПАРАЎ, КАСЬБЕ, УБОРЦЫ І ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК ГЭТАГА ГОДУ.

Прывітаньні другой ўсебеларускай канфэрэнцыі старых бальшавікоў

ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНУ

Лепшаму паплечніку Леніна, выпрабаванаму змагару ленінскай бальшавіцкай гвардыі, правадыру нашай партыі і сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіну другая ўсебеларуская канфэрэнцыя таварыства старых бальшавікоў шле гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК наша бальшавіцкая партыя прайшла слаўны шлях трыццацігадовай барацьбы за камунізм ад 2-га зьезду партыі да сусьветна-гістарычнага этапу пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным наша партыя пераможна ажыцьцявіла плян першай пяцігодкі за чатыры гады. Гэтай перамогі партыя дабілася ў барацьбе за няўхільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, з «левымі» загібамі і контр-рэвалюцыйным трацкізмам, шляхам бязьлітаснага разгрому ўсякіх антыпартыйных груповак.

На аснове вялізарнага росту творчай актыўнасьці рабочых і калгасных мас, на аснове магутнага росту нашай сацыялістычнай гаспадаркі, у рашучай барацьбе з клясавымі ворагамі партыя зараз з посьпехам вырашае задачы другой пя

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЧЫСТКА УМАЦУЕ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ І РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Н. КЛЕБАНАЎ

(член раённай камісіі па чыстцы КП(б)Б)

Некаторыя папярэднія ўрокі чысткі бягомльскай партарганізацыі

Праведзеная чыстка шасьці ячэек Бягомльскага раёну, у якіх прайшлі праверку 95 чалавек, што складае каля 30 проц. арганізацыі, дае ўжо некаторыя маленькія папярэднія вынікаў чысткі.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што вялікай перашкодай у рабоце камісіі па чыстцы зьяўляецца неадавальняючая падрыхтоўка да чысткі, адсутнасьць шырокай растлумачальнай работы як сярод партыйцаў, так і шырокіх мас калгасьнікаў. Асобныя члены партыі ня чыталі нават інструкцыі па чыстцы. Яшчэ горш справа стаіць з работай брыгад па самаправерцы. З 6 ячэек толькі ў дзьвюх больш-менш адавальняюча работалі брыгады. Складаныя характарыстыкі не адпавядаюць сапраўднаму становішчу. Мы сустрэліся нават і з такой характарыстыкай на члена партыі **Шыла** з Бяроскаўскай парт'ячэйкі: «Пляны выконвае поўнасьцю, дысцыплінаваны, прымае актыўны ўдзел у партжыцьці. П'янствам не займаецца, мае **нэрвовую хваробу на кулацтва і рэлігію**». Камэнтары да гэтай характарыстыкі непатрэбны.

Асабліва дрэнна стаіць справа з улікам партарганізацый. Ні ў адной з ячэек немагчыма знайсьці дасканалага ўліку членаў ячэйкі. Шмат выключаных ячэйкамі не зацьвярджаліся РКК па 6 месяцаў. Есьць і такія, якія прыняты ў партыю, а ячэйка аб іх ня ведае. Камісіі прышлося шукаць камуністаў і ўстанаўляць ячэйкі.

Такому становішчу спрыяла тое, што ў раёне быў некаторы самавол у сыстэме пазбаўленьня годнасьці камуніста. Мы сустрэліся з выпадкамі, калі нават вясковыя пасэўтройкі выключалі камуністаў з партыі і адбіралі партбілеты (у **Кругляніна** з ячэйкі калгасу **Нагорнае**). Прадстаўнікі РКК і пракуратуры адабралі партбілет у члена партыі **Шыла Хведара** з **Асаўскай** ячэйкі, адабран партбілет нейкім прадстаўніком у батрачкі **Камінскай Вольгі** з тойжа **Асаўскай** ячэйкі. І такіх выпадкаў шмат.

Райком ня ведае ня толькі аб асобных камуністах, а нават, дае ячэйкі, дае кандыдацкія групы. Так, у адной ячэйцы **Бяроскаўскай** сабраліся тры ячэйкі з 3 сакратарамі. Аказваецца, райком іх зьліў, а ячэйкі аб гэтым ня ведаюць. Толькі ў выніку работы камісіі па чыстцы ўдалося ўстанавіць ячэйкі і камуністаў. Сакратар райкому тав. **Анісаў** на нарадзе партактыву, прызнаўшыся ў такім хаосе, заявіў, што «толькі чыстка дапаможа нам устанавіць сапраўдны ўлік камуністаў і ўнесьці ў яго парадак».

Такое становішча з падрыхтоўкай да чысткі адбылася на актыўнасьці ў самой чыстцы. У некаторых ячэйках нікамуністы, ні беспартыйныя на сходах аусім не выступалі. Наадварот, у асобных ячэйках, дае чыстка была падрыхтавана, мы мелі вялікую актыўнасьць членаў ячэйкі і калгасьнікаў, дапамагаўшых камісіі выявіць недахопы ў ячэйцы і твар кожнага камуніста.

Чыстка ўскрыла буйнейшыя недахопы ў рабоце ячэек раёну. Асноўнае — гэта **адсутнасьць шырокай масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў**. Гэта работа падмянялася сыстэмай грубага адміністраваньня і скажэньня клясавай лініі. Напрыклад, у **Вітуніцкай** ячэйцы пад кіраўніцтвам сакратара праводзілася сыстэматычнае адміністраваньне, заціск самакрытыкі, запалохваньне, звальваньне ўсёй віны за правалы ў сельсавеце на ўсіх сялян-калгасьнікаў, аднясеньне ўсіх сялян да кулакоў.

Адзін з асноўных недахопаў правяраемых ячэек — гэта **безадказнасьць у кіраўніцтве калгасамі**, у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Прыкладам **можа служыць ячэйка калгасу «Герой працы»**, дзе за 6 месяцаў на сходах ня было пастаўлена ніводнага канкрэтнага пытаньня з калгаснага жыцьця. Таму ня дзіўна, што ў калгасах гэтых ячэек выяўлена засьмечанасьць кулацкімі элемэнтамі, шмат безгаспадарчасьці.

Чыстка гэтых ячэек з усёй яснасьцю паказвае, што прычыны такога становішча заключаюцца ў тым, што **з боку РК і раённых кіруючых арганізацый ня было неабходнага апэрацыйнага кіраўніцтва ячэйкамі**, ячэйкі былі прадастаўлены самі сабе. Шырока практыкавалася сыстэма наплыву ўпаўнаважаных з раёну, якія фактычна абязьлічвалі вясковыя арганізацыі і асобных камуністаў, а не арганізоўвалі іх, не дапамагалі ім працаваць.

Другой прычынай зьяўляецца **палітычная нянісьменнасьць вясковых камуністаў**. Вельмі мала маглі адказаць камуністы на самыя элемэнтарныя палітычныя пытаньні. У гэтым вялікая доля віны ячэек. Даволі сказаць, што ў праверяных 6 ячэйках за год было праведзена па 3-4 заняткі гуртковай партасьветы.

Адна з прычын адставаньня сельсаветаў у палітычна-гаспадарчых кампаніях, прарываў у калгасах, скажэньня клясавай лініі, апартуністычнай практыкі — гэта **засьмечанасьць гэтых ячэек кулацкімі перараджэнцамі**. Вышэй было паказана скажэньне лініі партыі ў Вітуніцкай ячэйцы. Хто-ж праводзіў там шкодную работу? Аказваецца, **Раловец** — сакратар ячэйкі, былы кантрабандыст, мае цесную сувязь з маткай — арганізатарам баптыстаў і агітатарам супроць савецкай улады. Раловец абаранае свайго дзядзьку — кулака ад вычышчаньня яго з калгасу, а ў той самы час арыштоўвае беднякоў калгасьнікаў. Гэты заядлы правы апартуніст, перараджанец — граў на руку клясаваму ворагу. Быў у ячэйцы **Раблевіч**, які ў часы грамадзянскай вайны служыў у белых, а зараз агітуе супроць мерапрыемстваў партыі ў веснавой сяўбе. **Пятроўскі** служыў белапольскім старастай і нямала дапамагаў польскай дэфензыве, быў у саюзе русскага народу.

У Асаўскай ячэйцы выключан з партыі **Поляк Сымон**, які меў цесную сувязь з высланымі кулакамі, дапусьціў поўны правал у сваёй рабоце, як загадчык хаты-чытальні і як сакратар ячэйкі. Выкрыты такія камуністы, як **Шыла Якуб, Шыла Дзям'ян і Тэрах Антон** у Асаўскай ячэйцы, якія канчаткова перараділіся, абаранялі кулакоў і былых людзей. Ачышчаны ячэйкі і ад такіх, якія выпадкова трапілі ў рады партыі, нават доўгі час ня ведалі аб тым, што яны партыйцы. Частка выключана за адрыў ад партжыцьця, недысцыплінаванасьць, непрыкладнасьць у рабоце.

Тое, што з праверяных 95 чалавек вычышчана каля 40 проц., сьведчыць аб засьмечанасьці гэтых ячэек і зьяўляецца вынікам пагоні за колькасьцю пры вярбоўцы ў партыю. Чыстка гэтых ячэек паказала, што адсеяўшы нават такую вялікую колькасьць, ячэйкі здаравіліся, яшчэ больш узьнялі свой аўтарытэт, і гэтым сталі больш баяздольнымі, каб лепш справіцца з заданьнямі, пастаўленымі партыяй перад вясковымі камуністамі.

Разам з буйнымі недахопамі, выкрытымі ў праверяных ячэйках, засьмечанасьцю партыйных радоў, неабходна адзначыць і **асноўную** масу камуністаў, прашоўшых чыстку. У клясавай барацьбе з кулаком, у барацьбе за сацыялістычную перабудову вёскі мы маем сумленных, адданых партыі камуністаў, якімі ганарацца калгасьнікі, камуністаў, якія зьяўляюцца сапраўднымі перадавікамі калгаснага будаўніцтва. Весь прозьвішчы толькі некаторых з гэтай масы: **Курыловіч Юлія, Катэка Александрына, Русановіч**, якія зьяўляюцца актыўнымі барацьбітамі за новае жыцьцё, паказваюць лепшыя прыклады ў барацьбе за працдысцыпліну. Вось **Хамутоў і Капусьцянскі** з Бяроскаўскай ячэйкі — старшыні калгасаў — першыя скончылі сяўбу, паставілі ўзорна дысцыпліну і арганізацыю працы, карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод калгасьнікаў. **Юхнавец** — актыўны калгасьнік, дзесяць год служыў у Чырвонай арміі, удзельнік партызанскіх атрадаў, чырвонасьцяжнік. **Субічаў, Шыла Кузьма** — актыўныя з Асаўскай ячэйкі.

Перад камісіяй упяродзе яшчэ вялікая работа. Райкому неабходна ўлічыць урокі чысткі першых ячэек, упарта і настойліва ўзяцца за зьяшчэньне выяўленых камісіяй недахопаў, расставіць партсілы, падцягнуць астатнія ячэйкі ў падрыхтоўцы да чысткі.

Няма ніякага сумненьня, што парт-арганізацыя Бягомльскага раёну, ачысьціўшыся ад усяго чужога, перараджэнцкага ў яе радох, ад баласту, выйдзе яшчэ больш згуртаванай і баяздольнай, зьявіцца моцным партыйным атрадам на мяжы.

Камунараўцы абавязваюцца рахункі аплаціць

... Роўна ў пяць гадзін стол прэзыдыуму займае праверком і чыстка праводзіцца далей.

... Сёньня чыстку праводзіць тав. ЛАБУДЗЬ — герой 1-ай пяцігодкі. У партыі — з 1924 г., удзельнік грамадзянскай вайны. Лабудзь на заводзе — з 1925 году, працаваў токарам, а з 1930 году — майстрам такарнага цэху.

Лабудзь майстар-ударнік, у яго ёсьць чаму навучыцца моладзі.

Камсамольцы і маладыя рабочыя такарнага цэху любяць і паважаюць Лабудзя, у спрэчках яны адзін за адным гавораць аб гэтым.

— Пад яго інструктажам вырасьлі многія кваліфікаваныя такары.

Сёньня камсамол цэху прад'яўляе свой сацыялістычны рахунак Лабудзю. Гэты сац. рахунак у асноўным адзначае асобныя недахопы Лабудзя, як інструктара:

— У варштаце № 25 цэнтры няправільна ўстаноўлены і пасьля абточкі і сьвідраваньня муфты выходзяць нядобракасныя, праточка крывая.

— Токар Каленчык зрабіў 20 падшып нікаў браку, а вось тав. Лабудзь, як майстар, не дагледзеў гэтага, не папярэдзіў у самым пачатку.

— У цэху токараў не хапае, а вось Казінец, токар 3 разраду, працуе ня дрэнна, а яго паставілі на цісочную работу і ён там стаіць ужо больш 9 месяцаў і яго не пераводзяць на другі варштат. Ці вось яшчэ аварыі, палом кі часта бываюць у моладзі, а хто ў гэтым вінаваты? Так, напр., Хасіна рэпулюе і падпіскае падшыпнікі пры дапамозе малатка і зубіла, а майстар на гэта не зварачае ўвагі. Яна ня ведае, як абыходзіцца з варштатам, яе з ім не знаёмілі. Токар Ганчаронак нядаўна пастаўлена на больш кваліфікаваную работу, у яе патрон не ў парадку, а майстар мер ня прымае.

— Маладыя токары Вольпэр, Кітайчык і інш. не атрымліваюць належнай увагі.

Камсамольцы і беспартыйная моладзь патрабавалі ад Лабудзя ўлічыць гэтыя упушчэньні, выправіць іх і перадаць маладым рабочым свой шматгадовы вопыт, падрыхтаваць з іх добрых кваліфікаваных рабочых. І Лабудзь па-бальшавіцку з трыбуны чысткі даў абавязацельства **РАХУНАК МОЛАДЗІ ПОЎНАСЬЦЮ АПЛАЦІЦЬ.**

Чыстку праходзіць ЛЯХОВІЧ — стругальшчык, член партыі.

Ляховіч ударнік, прамфінплян перавыконвае, вучыцца, партнагрузку выконвае.

... Пасьля многіх выступленьняў, даючых характарыстыку тав. Ляховічу, слова атрымаў тав. ЖУК.

— Я, калі можна так сказаць, гавару ад імя варштату № 61, на якім тав. Ляхавіч працуе. Варштат куплены на залатую валюту ў Нямеччыне для павялічэньня магутнасьці заводу ў першым годзе першай пяцігодкі.

Раней на гэтым варштаце працаваў рабочы МАНУХІН — вядомы п'яніца. Цэлыя дні варштат прастойваў, заставаўся бяз усякага догляду. Манухін-жа гуляў, піў і прамфінпляну ніколі ні выконваў. У 1932 годзе ля варштату № 61 стаў змаэчык тав. Ляховіч. Ён хутка пачаў яго выязучаць і зараз свае вытворчыя заданьні і ў якасных і ў колькасных адносінах перавыконвае. Тав. Ляховіч дабіўся такой прадукцыйнасьці, што добраахвотна зьнізіў расцэнкі на бетонныя ножкі з 32 кап. да 30 і па рамонтных работах — на 2-3 проц.

Тав. Ляховіч і надалей можа застацца працаваць на каштоўным імпартным варштаце пры ўмове, што:

1. Папярочны вінт ён будзе змазваць так, як іншыя часткі.

2. У пагоні за большым заработкам ён ня будзе рабіць непасільныя стружкі, бо аварый варштат не павінен цярпець, і

3. Пад варштатам павінна быць таксама чыста, каб неабходныя прысгасаваньні і інструмант не валяліся і склад валіся ў шафу.

Тав. Ляховіч даў абавязацельства гэтыя ўмовы выканаць, яшчэ больш націраваць сваю энэргію і ўвагу на аўладаньне тэхнікай, на дачу высокаякаснай прадукцыі.

А вось становішча варштату «Фракцыён» і варштату «Шэлінг» інакш характарызуе працуючага на іх кандыдата партыі т. ПІНТУСАВУ.

Гэтыя варштаты дрэнна даглядаюцца, у тав. Пінтусава інструмант не ў парадку, яны завалены рознымі дэталямі з усіх бакоў. Пінтусаў кандыдат партыі з сакавіка 1932 г., але ён палітычна слаба падрыхтаваны і зусім слаба аўладаў тэхнікай свайго варштату.

Старшыня камісіі па чыстцы дае слова прышоўшым на чыстку рабочым Менскай электрастанцыі для прад'яўленьня сацыялістычнага рахунку. Слова атрымлізе ад рабочых электрастанцыі тав. ШЭЙНМАН, які перадае парткалектыву і рабочым камунарам, што прад'яўлены імі сац. рахунак электрастанцыі за дрэнную работу і перабойную падачу энэргіі яны цалкам прынялі, што гэтыя перабоі тлумачацца, галоўным чынам, тым што на станцыю прапезьлі чужыя людзі, якія шкодзілі ў рабоце, як напрыклад, заг. рамонтным цэхам ШАБУНЕВІЧ, які выключан з партыі, ці былы рэдактар шматтыражкі КУБРЫНСКІ — сын кулака-спэкулянта.

Гэтыя людзі вычышчаны з партыі, вычышчаюцца і са станцыі. Рабочы калектыў станцыі пад кіраўніцтвам партыі з усёй рашучасьцю выганіць са станцыі ўсіх, хто прапез туды, каб падрываць работу гэтага найважнейшага нэрва станцыі.

Калектыў станцыі запэўнівае, што па-баявому перабудуе сваю работу, пабальшавіцку падрыхтуецца да асеньня-зімовага сэзону.

АЛЕ ГЭТА ПАТРАБУЕ І ДОБРАЙ РАБОТЫ АД ТЫХ ЗАВОДАЎ, ЯКІЯ ВЫРАБЛЯЮЦЬ ДЛЯ НАС АСОБНЫЯ ЗАКАЗЫ І, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, АД ЗАВОДУ «КАМУНАР».

Так, з-за недобраякаснага рамонту крывашыпнаў на заводзе «Камунар» па яго віне было 5 дзён прастою, у выніку недадана станцыі 1.500 тон торфу.

Няправільны разьмеры зробленых карэтак да вагонаў. Запасныя часткі да топак, зданыя яшчэ ў маі, ня пушчаны ў работу, і гэта пагражае затрыманьнем пуску катла № 4. Ад выражнай работы камунараўцаў у значнай ступені залежыць пасьляховая работа станцыі, і эльвадаўцы, прад'яўляючы свой сацыялістычны рахунак, патрабуюць выразнай, добраякаснай работы і своячасовага выкананьня заказаў.

Партыйны калектыў і ўсе рабочыя «Эльводу» ўпэўнены, што, шырока разгарнуўшы крытыку, камунараўцы ачысьцяць рады партыі ад усяго чужога, пнілога, разлажыўшагася, што ёсьць на заводзе.

З адказным словам ад «Камунара» выступіў тав. МАРГОЛІН.

— Сацыялістычны рахунак Эльводу камунараўцы цалкам прымаюць, упічаць дапушчаныя недахопы і заказы электрастанцыі выканаюць датэрмінова. Але мы патрабуем ад рабочага калектыву Эльводу дабіцца ліквідацыі існуючай абязьлічкі на станцыі ў дачы заказаў. Сачыць за правільнасьцю чарцяжоў і своячасовай дастаўкай неабходнага для заказаў матэрыялу.

Рабочыя «Камунара» яшчэ больш павысяць сваю пільнасьць, разгорнуць крытыку і самакрытыку ў выяўленьні ўсіх недахопаў у рабоце, ачысьцяць сваю партыйную арганізацыю ад усіх чужых, прымазаўшыхся элемэнтаў, ад усіх нездольных [illegible] за лінію партыі і насіць высокае гоматасьць члена партыі.

Чыстка працягваецца...

С. ХАЙМОУСКІ.

Яшчэ больш разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку

Слаба праведзеная падрыхтоўчая работа да чысткі партарганізацыі ў друкарні імя Сталіна, як вядома, прымусіла гарадзкую камісію вынесьці спэцыяльную пастанову аб часовым прыпыненьні чысткі.

Зараз чыстка аднавілася. Якая работа была праведзена па забесьпячэньні масавага ўдзелу рабочых на сходах па чыстцы, па разгортваньні крытыкі, па дапамозе ў рабоце праверкому?

— Гутаркі па цэхах і брыгадах, індывідуальныя гутаркі, сход камсамольскага калектыву, пістоўкі, запрашальныя білеты, ілюстраваная газэта, лёзунгі — вось асноўнае, што было праведзена ў часе перарыву чысткі. Гэта бязумоўна дало свае вынікі. Яны відны як у вытворчай рабоце на прадпрыемстве, так і ва ўдзеле рабочых у чыстцы.

Камсамольская брыгада наборнага цэху ў адзнаку чысткі ўзяла на сябе абавязак датэрмінова выканаць работу па наборы падручніка для сямігодкі. Абавязацельства выканана. Набор закончан на 7 дзён раней тэрміну.

Больш шырока разгарнулася барацьба за якасьць, выяўляюцца своячасова бракаробы, ілжэ-ўдарнікі і інш. Наведваньне сходаў па чыстцы прыняло больш арганізаваны, больш масавы характар.

Аднак, ці можна лічыць, што парадком цалкам ужо дасягнут? Далёка не. Партарганізацыі прадстаіць яшчэ вялікая работа па сапраўдным забесьпячэньні выпуску высокай якасьці прадукцыі, па далейшым разгортваньні самакрытыкі і павышэньні актыўнасьці на сходах па чыстцы. Гэта-ж факт, што камуністы яшчэ прыходзяць на сходы са спазьненьнем, што актыўнасьць яшчэ невыстарчальная. Заслугоўвае ўвагі ўсё яшчэ слабы ўдзел у чыстцы камсамольскай арганізацыі. За ўвесь час (праверана ўжо 85 камуністаў) камсамольцаў выказалася ўсяго 13 чалавек.

* * *

23 чэрвеня на сход па чыстцы прышло больш 250 чалавек. Сход пачаўся своячасова. Праверку праходзіць Шыфрына — работніца пераплётнага цэху. Аб сябе гаворыць мала. У камсамоле з 1922 году. У партыі з 1926 г. Зараз сакратар цэхавой парт ячэйкі.

— Хто хоча слова? — пытае старшыня праверкому тав. СТАРАВОЙТАЎ.

БУРШТЫН, РУБІН, ЛЕВІНА — усе ў адзін голас заяўляюць:

— Прыкладная ўдарніца, лепшы сакратар цэх. ячэйкі растлумачвае ў цэху работніцам розныя неясныя пытаньні, наогул ДОБРАЯ КАМУНІСТКА.

— Ці ёсьць адмоўныя факты пра тав. Шыфрыну? — пытае Старавойтаў.

— НЯМА.

Чыстку праходзіць старшыня заўкому Бэргер. Хто такі Бэргер? Перад сходам агалёўся твар гэтага «камуніста» з дробна-буржуазнай душонкай.

Бацькі яго гандляры, пазбаўлены права голасу. Аднак, гэта не перашкаджае «камуністу» Бэргеру і да сёньняшняга дня жыць з імі сумесна ва ўласным доме, з уласнай гаспадаркай (карова і інш.).

— Ну, а як ён выконваў сваю работу, як старшыня заўкому? — пытае тав. Старавойтаў.

Добрага не сказаў ні адзін рабочы.

— Кіраваў з габінэту, у цэху ніколі ня бываў, работай сталоўкі ня цікавіўся, любіў даваць толькі дырэктывы, на крытыку ў шматтыражцы не рэагаваў, — так заявілі ў сваіх прамовах рабочыя ДВОСКІН, РЫУКІНА, ШЫФРЫНА і інш.

Адсюль зразумела, чаму не вялася барацьба з бракам, чаму ня было культ работы, чаму дрэнна працавала сталоўка і г. д. Бэргера менш за ўсё цікавілі грамадзкія справы. Ён глядзеў, як-бы лепш уладзіць свае ўласныя справы, сваю кар'еру. І трэба аддаць яму справядлівасьць, яму гэта ня дрэнна ўдавалася. Бэргер ня толькі старшыня заўкому, але ён разам з тым і член гарсавету, і герой пяцігодкі, і прэміраваны ўдарнік.

Тут сказваецца абураючая палітычная сьлепата партыйнага калектыву, які своячасова ня выкрыў твар гэтага гнілога камуніста. Тут сказваецца яўнае прытупленьне клясавай пільнасьці з боку бюро партыйнага калектыву. І дзіўным здаецца, што толькі на чыстцы, калі ўжо быў выкрыт твар Бэргера рабочымі, сакратар парткалектыву ЦЁМКІН прызнаў:

— Бэргер ня быў зьвязан з рабочымі, нячула адносіўся да іх патрэб, не адказваў на запытаньні...

Дзе быў раней тав. Цёмкін? Чаму даверыў адказнейшы вучастак работы чалавеку з клясава-чужой псыхапёгіяй, шкурніку, бюракрату і кар'ерысту?

Той факт, што толькі на сходзе па чыстцы разьвязаліся языкі і быў выкрыт твар Бэргера, сьведчыць, што з самакрытыкай у друкарні імя Сталіна справа стаіць дрэнна.

Чыстка праводзіцца далей. Бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкай партыйны калектыў, рабочыя друкарні імя Сталіна павінны выкрыць усіх тых, хто яварты высокай назвы члена партыі, выкрыць усе недахопы партыйнай і гаспадарчай работы.

Р. Д.

Праверком па чыстцы ячэек культасьветных устаноў

(Наркамасьветы, Белдзяржкіно, Бел. Акадэм. Навук, Гістпарт, Белта, ДБВ, Навук. Тэхн. Выдавецтва, ВПІ, БДУ, Індустрыяльны Пэдтэхнікум. Фізкульт. тэхнікум, Працасьветы, Яўрэйскі Дзярж. тэатр, БДТ, Радыёвяшчаньне, Курсы радыёвяшчаньня, Белдзяржбібліятэка) паведамляе, што 27-VI, а 11 гадзіне раніцы ў пакоі ГКК-РСІ (вул. К. Маркса, 14, п. 23) адбудзецца нарада сакратароў вышэй паказаных ячэек. Яўка ўсіх сакратароў абавязкова.

Старшыня ПРАВЕРКОМУ ПЭДЗР.

РАШУЧА СПЫНІЦЬ ІГНАРАВАНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ АБ ПАЛІТАДДЗЕЛАХ

У ПОЛАЦКУ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ПА-СТАРОМУ

Палітаддзелам саўгасу **«Варонічы»** сумесна з парт'ячэйкай і грамадзкасьцю быў выгнан з саўгасу шкодны, жулік, былы дыректар **Пятроўскі**, які па працягу трохгадовай сваёй работы давёў саўгас да поўнага развалу. Падрыхтоўку да насеўнай кампаніі Пятроўскі праваліў. За зімовы час з-за дрэннага догляду і, калі ласьня за вярбу голадам усю буйную рагатую жывёлу і коньскую цягавую сілу і г. д. і г. д.

Раённае кіраўніцтва ў асобе сакратара райкому тав. **Яўсеенкі** і старшыні РВК тав. **Шаболтаса** ўзяло на сябе ролю абаронцаў шкодніка-апартуніста Пятроўскага. Не правяраўшы сапраўднасьці фактаў аб Пятроўскім, Яўсеенка і Шаболтас заявілі, што **«мы пастанову палітаддзелу скасуем»**.

Пасьля таго, як Пятроўскі разваліў саўгасную гаспадарку, ён быў райкомам партыі пакіраван старшынёй камісіі **«Чырвоны артылерыст»**. Дасланы палітаддзелам у раённую газэту «Чырвоная Полаччына» матэрыял аб злачынных дзеяньнях Пятроўскага не надрукавалі.

Старшыня РКК тав. **Мурзіч** проста заявіў: «Многа вас (палітаддзельцаў) лапаехала, а работы ня відаць».

Няўжо-ж для кіруючых работнікаў Полацку пастанова ЦК УсеКП(б) аб узаемаадносінах райкомаў партыі з палітаддзеламі не зьяўляецца абавязковай і ці не пара ўзяцца за сумленную працу, а не перашкаджаць палітаддзелу працаваць?

Работнікі палітаддзелу:

Сакалінскі, Ільлін.

АД РЭДАКЦЫІ: 16 чэрвеня «Зьвязда» зьмясьціла ліст начальніка палітаддзелу Полацкай МТС тав. Берзінга аб антыпартыйных адносінах Полацкага райкому партыі да палітаддзелаў. «Зьвязда» патрабавала ўжыць неадкладныя рашучыя меры. Полацкі РК КП(б)Б абгаварыў матар'ял «Зьвязды» і прыняў пастанову, у якой цалкам прызнае свае апартуністычныя памылкі і абязьцяецца канкрэтнымі справамі выправіць іх.

Сёньня мы друкуем ліст работнікаў палітаддзелу саўгасу «Варонічы», які паказвае, што пастанова Полацкага РК КП(б)Б засталася пустой дэкларацыяй, што зьмен у адносінах РК да палітаддзелаў няма ніякіх, сакратар РК Яўсеенка, старшыня РВК Шаболтас і старшыня РКК Мурзіч па-ранейшаму сваёй антыпартыйнымі адносінамі да палітаддзелаў перашкаджаюць ім у выкананьні тых вялізарнейшых задач, якія ўсіпадзены на іх партыяй.

„КАМЭНТАРЫ" ШПАКОЎСКАГА ДА ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б)

На сходзе партарганізацыі Бягомлі, дзе абгаварвалася пытаньне аб пастанове ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах і калгасных ячэйках, з яўна-апартуністычным цьсерджаньнем выступіў загадчык аргінстру райкому партыі Шпакоўскі.

Шпакоўскі пачаў з таго, што нібы ў Бягомльскім раёне і да пастановы ЦК існавалі вытворчыя калгасныя ячэйкі, якія быццам у выстарчальнай меры займаліся пытаньнямі калгаснай вытвор часьці, забясьпечылі правільную расстаноўку камуністаў і г. д.

Зразумела, у гэтым на першы погляд нямэ нічога дрэннага.

Трэба вітаць партарганізацыю, якая здолела забясьпечыць перабудову работы сваіх ячэек, паставіць у цэнтр увагі задачы калгаснай вытворчасьці і мабілізаваць на іх выкананьне ўсю масу камуністаў.

Але вітаць Шпакоўскага не дазвядзецца. Па-першае, таму, што у рэйне ёсьць усяго тры ячэйкі, якія носяць назву калгасных вытворчых ячэек. Па-другое, ні адна з гэтых ячэек на працягу ўсёй вясны ня ставіла ні аднаго вытворчага пытаньня і зусім не займалася асноўнымі пытаньнямі работы калгасаў.

Значыць, справа ня толькі ў форме, але, асноўнае ў зьмесьце работы. Цэнтральны Камітэт нашай партыі ў сваёй пастанове таму з асаблівай рашучасьцю патрабаваў не дэкларацыю, не павярхоўнага кіраўніцтва, а глыбокага веданьня і авалоданьня тэхнікай сельска-гаспадарчай вытворчасьці з боку кожнага камуніста, кожнай ячэйкі.

Зразумела, што Шпакоўскаму няісную калгасныя ячэйкі, як і іх работа, былі патрэбны толькі ў якасьці шыльды, за якой ён імкнуўся схаваць свае, яўна-антыпартыйныя погляды.

Хіба ня ясна, што яго выступленьне было накіравана на тое, каб зрабіць паклёп на пастанову ЦК, якая нібы ня ўкосіць нічога новага ў пытаньне работы вясковай партарганізацыі. У нас, кажа, былі калгасныя вытворчыя ячэйкі і да пастановы ЦК, таму пастанова па гэтым пытаньні зусім лішняя—вось асноўны тэзіс выступленьня Шпакоўскага.

Шпакоўскі гэтым самым імкнуўся выпустошыць вялізарны палітычны зьмест пастановы ЦК, прынізіць яе як палітычнае, так і практычнае выключнае значэньне для кожнага вясковага камуніста і ячэйкі ў справе дапешай барацьбы за ўмацаваньне калгаснага ладу. І Шпакоўскі зусім невыпадкова пераблытаў палажэньні статуту нашай партыі, гаворачы, што ў статуце быццам задоўга да пастановы ЦК запісана, што партыя будуецца па вытворчым прынцыпе, у той час, як на самой справе наша партыя будуецца па тэрытарыяльных адзінках.

Пазасобныя партыйныя ячэйкі раёну прапрацоўваючы пастанову ЦК і прыступіўшы да яе ажыцьцяўленьня, наробілі шмат буйных памылак. Асноўныя з іх заключаюцца ў тым, што, напрыклад, Недзальская ячэйка, не зрозумеўшы ролі вытворчай калгаснай ячэйкі, разьбіла камуністаў сельсавецкай тэрытарыяльнай ячэйкі (работнікаў сельсавету, кааператыўцы і інш.) па калгасах, арганізаваўшы з гэтых камуністаў калгасныя ячэйкі. Якія гэта будуць ячэйкі і як яны будуць працаваць, на гэта цяжка сабе ўявіць, калі ўлічыць, што гэтыя камуністы адарваны і ніякай сувязі з калгаснай вытворчасьцю ня маюць.

Надзвычай характэрна, што сход партарганізацыі не абгаварыў навіны шкоднага антыпартыйнага выступленьня Шпакоўскага, матывуючы позьнім часам і ня ўжыў ніякіх захадаў да таго, каб выправіць на-хаду дапушчаныя ячэйкамі памылкі.

Эль.

Кантактная работа

БАБРУЙСК (Наш кар.)

Арганізацыю палітаддзелу ў раёне пры Цялускай МТС Бабруйскі райком КП(б)Б сустрэў як неабходнае і сур'ёзнае мерапрыемства партыі па ўмацаваньні калгасаў. Больш таго, райком па ініцыятыве сакратара райкому тав. **Ваўксвіча** настойліва хадайнічаў перад адпаведнымі органамі партыі аб хутчэйшай арганізацыі палітаддзелу. Гэта абумовіла ўзаемаадносіны паміж райкомам і палітаддзелам, пасьля арганізацыі апошняга пры цялускай МТС.

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб калгаснай ячэйцы і ўзаемаадносінах паміж райкомамі і палітаддзеламі канчаткова замацавала жывую, дзелавую сувязь. У мэтах практычнай рэалізацыі гэтай пастановы прыступлена да рэарганізацыі партсеткі на тэрыторыі МТС.

Арганізуюцца даўно вытворчыя калгасныя партячэйкі. У 4-х калгасах ствараюцца кандыдацкія групы, у 8 калгасах парткамсамольскае ядро, і ў 30 калгасах устанаўліваюцца цесныя тут партарганізатараў, якія групуюць вакол сябе групы спачуваючых.

Уся гэта вытворчая партыйная работа непасрэдна накіраваецца палітаддзелу. Пад непасрэдным кіраўніцтвам райкому застаюцца тэрытарыяльныя (сельсавецкія) ячэйкі КП(б)Б і вытворчыя па пытаньнях фінансаў, сяўбы, асьветы і інш.

Для ўмацаваньня калгасаў МТС камуністамі, рэйпартарганізацыяй адкінута 25 партыйцаў.

Дабіўшыся перамогі на пасеўным фронце (план сяўбы на 25 мая выкананы на 110 проц.); палітаддзел зараз змагаецца за фрэзэрнае пракоўкі і ворыва папараў. На 20 чэрвеня калгасы МТС плян ворыва папараў выканалі на 100 проц. (узарана 1002 га) і праполкі на 70 проц.

П. Чыжук.

І. ВАРОНІН

На антыпартыйных пазыцыях

Новая абстаноўка на вёсцы характарызуецца канчатковай перамогай сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы.

Карэнныя капіталізму ў сельскай гаспадарцы падарваны, кулацтва разгромлена, але яно яшчэ не дабіта і аказвае шалёнае супраціўленьне.

Партыя дасягнула гэтых сусьветна-гістарычных перамог на аснове індустрыялізацыі, у непрымірнай барацьбе з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай, з «левым» апартунізмам і контр-рэвалюцыйным трацкізмам.

Гэтыя посьпехі вынікаюць з таго, што савецкая сыстэма гаспадаркі ёсьць сыстэма **ПЛЯНАВАЙ** гаспадаркі.

Роля пляну ў сацыялістычным будаўніцтве надзвычай вялікая.

Клясавы вораг добра ўяўіў сабе ролю пляну ў нашым будаўніцтве. Таму і ня дзіва, што ён ня раз прабаваў зрабіць сваю чорную справу — працягнуць у пляновую работу варожую нам тэорыю і практыку.

Гэта ўскладае на плянавыя органы надзвычайную адказнасьць, патрабуе ад іх рашучага ўмацненьня клясавай пільнасьці.

ДЗЯРЖПЛЯН БССР не зразумеў гэтай адказнасьці. Ён не зрабіў для сябе пінкіх вываадаў са справы контрэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі, выкрытай у Наркамземе і трактарацэнтры, не перабудаваў сваёй работы і ў выніку апынуўся ў ролі штампоўшчыка шкодных, па сутнасьці антысавецкіх дакумантаў.

Калі-б пільнасьць у Дзяржпляне была на вышыні, ён своячасова выкрыў-бы варожыя, контр-рэвалюцыйныя ўстаноўкі ў плянах, складзеных шкоднікамі з Наркамзему і Трактарацэнтру.

Але Дзяржплян БССР у сваёй рабоце па плянаваньні сельскай гаспадаркі, як паказваюць **МАТАР'ЯЛЫ ЦКК-РСІ**, сам стаяў на антыпартыйных пазыцыях, ня выконваў дырэктыў партыі і ўраду і ў радзе пытаньняў скаціўся да махровага апартунізму, правяўі простае нявер'е ў будаўніцтва сацыялізму на вёсцы.

XVII партыйная канфэрэнцыя з вычарпальнай яснасьцю вызначыла асноўныя задачы далейшага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця Савецкага саюзу. ЦК КП(б)Б і СНК БССР на аснове гэтых указаньняў далі канкрэтныя дырэктывы па разьвіцьці народнай гаспадаркі БССР.

XVII партканфэрэнцыя ўказала, што «ўсе мерапрыемствы па сельскай гаспадарцы патрабуюць далейшага, яшчэ большага ўздыму збожжавай гаспадаркі з тым, каб збожжавая прадукцыя да канца другой пяцігодкі дасягнула ня менш, як 1.300 млн. цэнтнэраў».

Ня гледзячы на сваю спэцыялізацыю па лініі жывёлагадоўлі і тэхкультур, БССР павінна рашуча ўмацніць сваю ролю ў выкананьні дырэктыў XVII партканфэрэнцыі па разьвіцьці **ЗБОЖЖАВАЙ** гаспадаркі. Наша рэспубліка павінна забясьпечыць максымальнае павялічэньне кол

Партыйна-масавую работу— у нізавое зьвяно

ВІЦЕБСК.

Партыйная арганізацыя швейнай фабрыкі **«Сьцяг індустрыялізацыі»** па сваім колькасным складзе — 342 члены партыі і 161 кандыдат—зьяўляецца самай буйной партарганізацыяй у Віцебску і адной з буйнейшых арганізацый у БССР.

Маючы ў гаяўнасьці такую вялікую сілу, нельга было сумневацца ў тым, што партыйна-масавай работай будуць ахоплены ўсе вытворчыя вучасткі і што яна будзе падпарадкавана барацьбе за прамфінплян. Аднак, прыходзіцца канстатаваць іншае. Аб перабудове партмасавай работы гаварылі шмат, а зрабілі мала. І ў гэтым галоўная прычына таго, што прамфінплян з месяца ў месяц скочваўся ўніз і дакаціўся ад 76,7 проц. у першым квартале да 54,7 проц. за май. Бракаванай прадукцыі за гэты час было зроблена 76.059 адзінак—гарнітураў і польтаў.

Фармальна да перабудовы партмасавай работы на фабрыцы прычыняцца нельга. Есьць 13 цэхавых ячэек, з іх 4 зменавыя, 17 партыйных груп на чале са сваімі партарганізатарамі. На 27 вучастках, дзе з-ва малалікасьці камуністаў нельга было арганізаваць партгрупы, таксама ёсьць партарганізатары. І г. д. і г. д. Але гэта толькі фармальна, па сутнасьці-ж мы мелі:

Поўны адрыў партыйнага камітэту ад цэхавых і зменавых ячэек і, у сваю чаргу, адрыў большасьці цэхавых ячэек ад сваіх партгруп і партарганізатараў.

Кіраўніцтва парткому спрадвеку і нізавым зьвяном заключалася выключна ў тым, што сакратар парткому т. **Шыфрын** скідваў да сябе ў габінет сакратароў ячэек, чытаў ім нагацыі, абмяркоўваў іх «шлюпам» і напярэдваў, што ў выпадку, калі яны ня выканаюць яго заданьня, яны будуць выключаны з партыі.

Характэрным прыкладам, як кіраўнікі адрываюцца ад масы, можа служыць тав. **Зьвягіна.** Яна вось ужо тыдзень як замяніла сакратара парт'ячэйкі цэху па шыцьцю штаноў, цэху, які знаходзіцца ў вялікім прарыве. У гэтым цэху ёсьць на сёньняшні дзень звыш 70.000 пар штаноў, патрабуючых перапрацоўкі. Тав. Зьвягіна больш чым 1 з пал. гады зьяўляецца членам бюро цэх'ячэйкі. Яна нават дакладна ня можа сказаць, колькі партгруп ёсьць у яе ў цэху.

Вось 19 чэрвеня істужкі № 14 і 12 (да істужкі № 12 прымацавана тав. Зьвягіна) сваёй праграмы ня выканалі, шмат перапрацовак (касыя швы, родная строчка). Што-ж т. Зьвягіна прадпрымела? Нічога. Да рэчы, на гэтых вучастках няма ні аднаго камуніста. На ўсіх тав. Зьвягіной, усе камуністы гэтага цэху зьяўляюцца прыкладнымі. Да іх-жа яна адносіць інструктара, члена партыі т. Боруховіча, які адмовіўся ад прыняцьця выбару рабочых яго групы на індывідуальнае спаборніцтва. З яго ўзяў прыклад беспартыйны інструктар т. Райзер. Вось ужо больш 1 з пал. месяца, як парткам не заслухоўваў справаздачы аб рабоце данай цэх'ячэйкі.

Возьмем для прыкладу другую істужку — відкічка а цэху, сакратар ячэйкі тав. **Чартной** у курсе справы ўсяго, што адбываецца ў цэху, але аб рабоце партгруп, пасобных вучастаў. Але ад таго, што ён у курсе справы, карысьці мала. Вось характарыстыка фазы.

Істужка 2 вучастку (партарганізатар групы Залежынскі) сыстэматычна ня выконвае свайго прамфінпляну. Што-ж прадпрымела ячэйка? На становаай бюро парт'ячэйкі вось ужо два тыдні, як Залежынскага і Жаваронкава вызвалілі ад абавязкаў партарганізатараў і гэту адказную работу ні кому не даручылі. У выніку—партгрупа 2-га вучастку бязьдзейнічае, а партгрупа 3-га вучастку ўжо пасьпела разваліцца.

Пасобныя члены партыі гэтых груп цьюкрэдытуюць годнасьць камуніста. Работніца, член партыі тав. **Гурэвіч** сваю апэрацыю выконвае нядобраякасна—радная выметка краю. Кандыдат партыі т. **Жыўлачэнка** за дрэнную работу сваёй апэрацыі атрымаў па адміністрацыйнай лініі вымову. На вучастку інструктара **Рутэнбэрга** штодзённа маюць месца прастоі, вялікія завалы прадукцыі. Якасьць выконваемай работы надзвычай дрэнная. Калі Рутэнбэргу ўказвалі на дрэнную работу яго вучастку, ён адказваў: «Няхай працуе той, хто атрымлівае вялікія пайкі». І зусім правільна паступіла ячэйка, калі яна гэтага перарадзэнца выключыла з партыі.

У мінулым месяцы пастановай Наркамлёгпраму СССР за дрэнную работу, асабліва за вялікі выпуск бракаванай прадукцыі, быў закрыт цэх польтаў. З 9-га гэтага месяца цэх зноў пушчан у эксплёатацыю, але патрэбнага пералому ў рабоце цэху ўсё яшчэ няма. Праграма цэху выконваецца на 50-60 проц. Кала 20 проц. выпускаемай штодзённа прадукцыі трэба перарабляць. 10-15 проц. прадукцыі ідзе ў брак.

Парт'ячэйка гэтага цэху адарвана ад сваіх камуністаў, ёй няма ніякай справы да таго, што рабочы, член партыі **Шкляр,** вядомы ў цэху, як адзін з самых дрэнных рабочых. «Можаце мяне вычысьціць з партыі» — звычайна адказвае Шкляр, калі яму ўказваюць на яго дрэнную работу. Член партыі **Багданаў** прыходзіць на работу п'яным і адміністрацыяй дапускаецца да працы, пры пасьпяшэньні назіраньні членаў бюро парт'ячэйкі.

Пастановай гаркому партыі дырэктар фабрыкі **Каган** і сакратар парткому **Шыфрын** зьняты з работы. Гэтыя апартуністы займаліся чым хочаце, толькі не канкрэтным кіраўніцтвам фабрыкай. Як партыйнае, так і гаспадарчае кіраўніцтва абноўлена.

Дзякуючы ўжытым мерам з боку абноўленага кіраўніцтва, увязны прадстаячай 25 чэрвеня чысткі партыі з абавязковым выкананьнем пляну, крыва выкананьня праграмы павысілася ад 54.7 проц. у мае да 88 проц. за 15 дзён чэрвеня. Аднак, у якасным выпуску прадукцыі пералому ўсё яшчэ няма.

Стопроцатнага выкананьня пляну як па колькасных, так і па якасных паказальніках можна будзе дабіцца толькі ў тым выпадку, калі партыйна-масавая работа будзе сапраўды ўкаранёна ў сыстэму штодзённай работы партгрупы, партарганізатара, калі партком фабрыкі як сьлед умацуе сярэдняе і нізавое партзьвяно. Актыўны ўдзел рабочага калектыву ў часе чысткі забясьпечыць выдаленьне з радоў партарганізацыі фабрыкі тых, хто апагаўвае высокую годнасьць членаў бальшавіцкай партыі. Партыйная арганізацыя буйнейшага швейнага гіганта — фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» зойме адно з перадавых месц у радох нашай партыі.

Арк. Зарубежны, Мінуцкі.

ЧАМУ АДСТАВАЛА АСЬВЕЙШЧЫНА

(Ліст буксірнай брыгады)

Плян веснавой сяўбы па Асьвейскім раёне складаўся ў гэтым годзе з 15 тыс. 207,5 га. З іх па калгасным сэктары 6 тыс. 905,5 га, па аднаасобным—7810, саўгасах—275 га, і 217 га па прыгарадных гаспадарках.

Раён увесь час адставаў па сяўбе. Чым-жа выклікана было ганебнае адставаньне

Перш за ўсе яўна нездавальняючай фармальная падрыхтоўкі. У калгасах «Новы Шлях», імя Чарнякова (Сухарукаўскі с-с.) з-за адсутнасьці выбораў чых заданьняў брыгады распаліся. Такое-ж становішча наглядалася і з давядзеньнем пляну да с-саветаў. У Чорыкаўскім с-с, напрыклад, даведзен плян у 60 га 21 гаспадарцы, а таких гаспадарак зусім у с-с няма.

У раёне прымірэнча адносіліся да кулацка-заможных гаспадарак. У Зязеўскім с-савеце дашлі нават да таго, што абышлі пры ўручэньні пляну кулакоў і заможнікаў. Кулацкі сабатаж сяўбы не сустракаў адпаведнага адпору. У вёсцы Гарнуўка (Таханаўскі с-с) кулацкая група на чале з Лісоўскім усюды адчынена заяўляла: «сеяць ня будзем, няма насеньня». Замест адпору, кулакам дапамагалі ныць, і ўпаўнаважаныя РК і РВК. Упаўнаважаны тав. Анішчанка заявіў, што «калі не дадуць насеньня, значыць не засеем».

Многія с-с і ўпаўнаважаныя спасылаліся на аб'ектыўныя прычыны: «вельмі мокрая глеба, як-жа тут фарсаваць сяўбу?» У выніку такой апартуністычнай установкі раён увесь час танебна плёўся ў хвасьце.

Бязьдзейнасьць МТС на чале з Дырэктарам Радзівонавым прыняла да таго, што на 1-га чэрвеня скончылі сяўбу толькі 3 калгасы—«Фразэрны», імя Сака—Ванцэці, і Асавецкі. З 30 трактараў МТС на калгасных палёх працавала ня больш 60 проц., астатнія з прычыны дрэннага рамонту выйшлі са строю.

Кіраўніцтва раёну зусім выпусьціла з пад увагі шытаньне барацьбы за якасьць сяўбы і ўздым ураджайнасьці. Амаль усе пасевы засяваліся ў аднавор, прычым ворыва вельмі дрэннае. Радковым севам не засеяна ні аднаго га.

Выхаваўчая работа ў калгасах, сацспаборніцтва памж с-с і калгасамі—адстаючы вучастак у раёне.

Раённае кіраўніцтва Асьвейшчыны -РК КП(б)Б і РВК займалася дэкларацыйнасьцю, замест канкрэтнай упартай барацьбы за сяўбу.

ЦК КП(б)Б накіравала у Асьвейшчыну буксірную брыгаду ад Рагачоўскага раёну ў складзе 5 асоб. Выявіўшы прычыны адставаньня раёну, наша брыгада ўзяла самыя адстаючыя с-саветы і адразу-ж пераключылася на практычнае перапясеньне вопыту Рагачоўшчыны ў работу гэтых с.-саветаў, і вывелі іх з глыбокага адставаньня

ФЛЕЕР КУКРАШ

Пакараць раскрадвальнікаў каапэрацыйнай маемасьці

(Ліст рабочых).

Шкодніцкая група ў Гарочынскім сель-спажыўтаварыстве (Мазырскі раён) на чале з рухавікаводам Шлейфэрам і крамнікам Пташкевічам дыскрэдытуе савецкі гандаль.

Ня так даўно для закупак збожжа ў таварыства было завезена каля 300 кілёграм цукру. Замест таго, каб скарыстаць яго па прызначэньні, рахункавод Шлейфэр палічыў больш выгодным разьмеркаваць цукар паміж «сваіх» людзей. Значную частку яго Шлейфэр з Пташкевічам забралі сабе, а астатні раздалі знаёмым. Плян дзяржаўных закупак збожжа па с-с сарвалі. З 40 тон па пляну закуплена толькі 8 тон.

Загатоўка яек праводзіцца выключна для сваіх мясцовых патрэб. Яйкі, якія былі загатоўлены па пляну, забраны работнікамі сельспажыўтаварыства іх сваякамі. Алей, які прывозіўся для прамяўваньне лешных здатчыкаў ільну, таксама скарыстан для спажэньня апарату таварыства.

Разбазарваньне каапэрацыйнай маемасьці ўвайшло ў сыстэму работы Гарочыцкага сельспажыўтаварыства. У канцы 1932 году таварыства атрымала 2 скрыні цывікоў для фарсаваньне аб'ектаў буданіцтва ў калгасах. Цывікі рухавікавод Шлейфэр забраў сабе, і абменьваў іх на мёд для сваіх патрэб.

Нядаўна сельсаветам было перадана у СТ 40 кг. сала, на заўтра-ж яно зьнікла і трэба спадзявацца, што далей рук Шлейфэра не пайшло.

СТ забясьпечвае прадуктамі рабочых лесазаводу станцыі Гарочыцы. Амаль штомесячна рабочыя не даатрымліваюць прадукты. За апошні месяц заводу не дадзілі 16 пайкоў і гэта таму, што яны разбазараны Пашкевічам.

СТ абслугоўвае сталоўку заводу, але грамадзкае харчаваньне наладжана з рук вон дрэнна. Загатоўленыя для сталоўкі 50 пудоў буракоў, 30 пудоў моркві згноены, а астачу прадуктаў—120 пудоў бульбы рахункавод Шлейфэр забраў для свайго спажываньня.

Самазагатовак прадуктаў для сталоўкі СТ не праводзіць. Сьвінаадкормачны пункт пры сталоўцы ў занядбане. З за нядбайных і шкодніцкіх адносін да яго з боку абслугоўваючага персаналу і кіраўніцтва СТ з 17 сьвіней засталося жывымі толькі 11.

Аб усіх гэтых злачынствах на разсьнталізаваў нізавы друк, аднак партыйныя ячэйкі с-с мер ня прымаюць і сваёй апартуністычнай бязьдзейнасьцю пакрываюць злачынцаў.

К. Т.

Ад рэдакцыі:

«Зьвязда» патрабуе ад Мазырскай рай. пракуратуры тэрміновага расьледваньня паданых фактаў.

Мабілізаваць працоўныя масы на выкананьне фінпляну

СЬПІС раёнаў, якія ганебна зрываюць рэалізацыю пазыкі другой пяцігодкі

НАЗВА РАЁНАЎ	Месца, якое займае раён	Проц. выканаўчага пляну раёну	Проц. па аднаасобным сэктары	Старшыня райкамсоду	Заг. райфа	Заг. райкаопы
Бешанковіцкі	75	40,5	3,9	Шах	Шаб алтас	Лейчанка
Чырвонапольскі	74	56,5	2,6	Кіреєў		Карпенка
Веткаўскі	73	59	3,9	Сьліўкін	Шэнкман	Салаўёў
Кармянскі	72	59	4,8	Кін	Голубеў	Наўмёнак
Клічаўскі	71	59,9	7,5	Грыбаедаў	Андруковіч	Вусаў
Церахаўскі	70	60	2,8	Дупанаў	Карнейчык	Бібікаў
Уваравіцкі	69	60	3,1	Караленка		Іванчыкаў
Сураскі	68	62,2	3,5	Русак	Манюк	
Нараўлянскі	67	64,3	15,9	Белькін	Ансючанка	Кацапаў.

За ўтойваньне абкладваемага звароту— да суровай адказнасьці

Пленум Вярхоўнага Суда СССР зьвярнуўся праз газэту «Экономическая жизнь» з растлумачэньнем аб прыцягненьні да адказнасьці вінаватых за ўтойваньні плацяжоў у бюджэт.

Вярхоўны Суд піша, што мясцовыя органы пракуратуры і суда зварочваюць слабую ўвагу і павольна расьследваюць і прыцягваюць да адказнасьці кіраўнікоў і бухгальтараў прадпрыемстваў і арганізацый аграмаджанага сэктару, якія не даюць правільных вестак і памяншаюць належачыя з іх прадпрыемства плацяжы ў бюджэт.

Падкрэсьліваючы выключную ролю дзяржаўнага бюджэту ў ажыцьцяўленні народна-гаспадарчага пляну другой пяцігодкі, Вярхоўны Суд растлумачыў, што ў выпадку ўтойваньня належачых у бюджэт сум шляхам памяншэньня справаздачных даных, падлягаючых аб кладаньню падаткам зваротаў прадпрыемстваў і арганізацый аграмаджанага сэктару, трэба разглядаць, як буржуаз на-нашманскае скрыўленьне ідэй гаспадарчага разьліку.

Пракуратура і судовыя органы павінны неадкладна ўключыцца ў кампанію па ўкараненьні ў практыку прад прыемстваў і арганізацый суровай бюджэтнай дысцыпліны. Разглядаць справы зрыву бюджэтнай дысцыпліны ў найкаракейшы тэрмін.

Вінаватыя ў гэтых злачынствах павінны карацца згодна адпаведных артыкулаў крымінальнага кодэксу.

Асабліва злачынныя выпадкі павінны разглядацца на паказальных працэсах і кіраўнікі прадпрыемстваў прыцягвацца да максымальнай адказнасьці.

Калі няправільнае прадстаўленьне вестак зроблена з-за няправільнага ўліку і справаздачнасьці, кіраўнікі ўстаноў, бухгальтары і вінаватыя работнікі статыстычнага апарату адказваюць па адпаведных артыкулах, як за бязьдзейнасьць і нядбайныя адносіны да выкананьня службовых абавязкаў.

Спыніліся на меркаваньні

БЫХАЎ. Яўная недаацэнка справы рэалізацыі пазыкі і выкананьня фінпляну з боку райкому партыі і РВК зьяўляецца асноўнай прычынай ганебнага адставаньня раёну. Раённыя кіруючыя органы-справай рэалізацыі пазыкі не займаюцца. Асабліва дрэнна стаіць справа з рэалізацыяй пазыкі сярод аднаасобнага сэктару. Там процант вы кананьня складае толькі 3. Агульны плян мабілізацыі сродкаў выканан ўсяго на 64 проц.

Ня гледзячы на нізкае выкананьне фінпляну, райком партыі і РВК не ўзьнялі гэтага пытаньня на належную вышыню. Было меркаваньне на пленуме райкому і РКК 10 чэрвеня завастрыць пытаньне аб рэалізацыі пазыкі і наогул аб становішчы з выкананьнем фінпляну другога кварталу. На жаль, меркаваньне гэта ня выканана. Сакратары парт'ячэек з пленуму разьехаліся з думкай, што на фінансавым фронце ўсё ў парадку.

Паказальным будзе і той факт, што пасьля інфармацыі загадчыка Райфа тав. **Торбіка** аб новым законе па-сельгаспадатку на пленуме райкому фінансавыя работнікі хацелі разгарнуць спрэчкі, але аргаддзел райкому тав. **Рыкаў** заявіў: «У гэтым няма патрэбы». Гэта ў той час, калі фінработа па раёне пастаўлена так, як ня трэба горш.

Абслугоўваньнем пазыкатрымальнікаў у Быхаўскім раёне вельмі дрэнная. На 12 чэрвеня ў ашчадкасе аказаліся не разданымі аблігацыі пазыкі 4-га завяршальнага ў суме 104 тыс. рублёў. Шмат калектываў яшчэ не разьлічыліся па мінулай падпісцы і не атрымалі аблігацый.

Райпрафсавет Быхаву—толькі адна арганізацыя, якая сапраўды цікавіцца рэалізацыяй пазыкі. 8-га чэрвеня праведзен адзіны выходны дзень з мэтай масавага выхаду прафарганізацый у сельсаветы па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі. Гэта мерапрыемства дало 16 проц. выкананьня пляну і даказала, што пры шырокай масава-растлумачальнай рабоце можна дабіцца добрых вынікаў. Шкада толькі, што райфінаддзел не скарыстаў гэтага вопыту і, як раней, бюракратычна кіруе справай рэалізацыі пазыкі. Райапчадкаса, на якую ўскладзен увесь цяжар пазыковай работы, не атрымлівае дапамогі з боку раённых кіруючых органаў і працуе не апэрацыйна. Загачык ашчадкасы тав. **Кавалярчук** вельмі мала бывае на месцы і ня кіруе фінработай раёну.

Такое становішча павінна прымусіць быхаўскія арганізацыі зараз-жа зьмяніць мэтады кіраўніцтва. Трэба праявіць гібкасьць і апэрацыйнасьць, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю выканаць фінплян другога кварталу.

Вольлава.

Хныканьне замест работы

Рэалізацыя пазыкі другой пяцігодкі па **Прадзьвінскім** сельсавеце, Бабруйскага раёну праходзіць надзвычай дрэнна.

Ніякай палітычна-масавай работы як сярод калгасьнікаў, так і сярод аднаасобнага сэктару не праводзіцца. Плякаты і агітлітаратура валяюцца ў сельсавеце, а па калгасах і вёсках не распаўсюджаны.

Вёска Стасеўка—самы буйны насельны пункт сельсавету—зьяўляецца ў той-жа час і самым адсталым вучасткам у рэалізацыі пазыкі. Да гэтага пункту, праўда, у апошні час прымацаваны сам старшыня сельсавету **Шышоў** і нават упаўнаважаны РК КП(б)Б **Лянькоўскі.** Справа ад гэтага, аднак, ніколькі не палепшылася, бо як старшыня сельсавету, так і ўпаўнаважаны РК замест разгортваньня палітычна-масавай работы займаюцца хныканьнем аб цяжкасьцях і пальцам не краўць для таго, каб рэалізацыю пазыкі зрушыць з мёртвага пункту.

Ч.

Ход лесавывазкі

(у проц. да квартальнага пляну, на 20 чэрвеня)

ПЕРАДАВЫЯ ЛЕСПРАМГАСЫ:	Лесаматар'ялаў	Дроў
Любаньскі	115,6	116,0
Жыткавіцкі	89,3	78,5
Лельчыцкі	98,6	70,1
Прапойскі	100,8	22,3
Чырвона-Слабодзкі	160,0	—
Бягомльскі	110,2	—
АДСТАЮЧЫЯ ЛЕСПРАМГАСЫ:		
Асіпавіцкі	22,5	21,1
Бабруйскі	40,8	16,2
Бялыніцкі	10,1	16,3
Гомельскі	20,2	7,7
Віцебскі	13,6	2,1
Нараўлянскі	34,3	18,4
Рагачоўскі	25,1	15,4
Рэчыцкі	37,7	21,8

Агульнае выкананьне пляну лесавывазкі на 20 чэрвеня па БССР характарызуецца наступнымі лічбамі: лесаматар'ялаў вывезена 288.054 куб. мэтры або 38,9 проц. квартальнага пляну, дроў вывезена 183.426 куб. м., або 26,2 проц. квартальнага пляну.

Мерапрыемствы вызначылі, а праводзіць іх і ня думаюць

Вузьдзенскі леспрамгас заданьне другога кварталу па загатоўцы будаўнічай драўніны па 1-га чэрвеня выканаў толькі на 74,7 проц. і па загатоўцы дроў на 19,3 проц.

У мэтах ліквідацыі такога ганебнага адставаньня леспрамгас уключыўся ў абвешчаны ЦК і СНК БССР ударны месячнік лесазагатовак і вывазкі. Быў вызначан рад практычных мерапрыемстваў. Да кожнага прарабскага вучастку і брыгады, уласнага транспарту даведзены шматдзённыя заданьні. Кожны работнік леспрамгасу і вучастка прымацован да асобных вёсак.

Ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў павінна было забясьпечыць поўнае выкананьне пляну лесавывазкі ў колькасьці 10.800 кубамэтраў будаўнічай драўніны і 2 тыс. кубамэтраў дроў. На справе-ж вышла іншае. Мерапрыемствы вызначылі, а праводзіць іх ніхто і ня думае. У выніку—за першую пяцідзённку месячніка замест 1.650 кубамэтраў драўніны вывезена толькі тысяча.

Асабліва адстае другі вучастак (прараб **Кантаровіч**). Адставаньне яго тлумачыцца тым, што Кантаровіч ня можа арганізаваць і паставіць работу вучастку на належную вышыню.

Ю. Снытко.

Н. Цярэньцеў

Перамір'е ў Паўночным Кітаі і яго вынікі

[illegible] перамір'е паміж кітайскімі і японскімі войскамі — правільней паміж [illegible] кіраваньнем і пакінскім [illegible], заключанае фактычна яшчэ [illegible] мая, а падпісанае 31 мая, [illegible] сабой цэлы нарыд ваенных [illegible], якія пачаліся з захопу [illegible] войскамі ў студзені 1933 г. [illegible] Шанхай-Гуаню, на поўдзень ад [illegible], і прынялі гэтыя войскі [illegible] паўночнай сталіцы Кітаю [illegible]. Яно завяршыла сабой ра[illegible] тым сарыю ні з чым непарауных акцый здрэнцітка і сабатажу кітайскай рэакцыі ў асобе як паўночных кітайскіх генераляў, так і [illegible], самога пакінскага ўраду. У [illegible] Кітай страціў, у дадатак [illegible] Манчжурыі, правінцыю Жэхэ і [illegible] частку правінцыі Хобэй, ня кажучы ўжо аб унутранай Манголіі (правінцыя Чахар), у якую японская ар[illegible] прасоўваецца далей.

[illegible] Жэхэ і паўночным Кітаі [illegible] крывавым фарсам. Кітайскія ра[illegible] генералы вялі яе зусім так, як яны врывыклі весьці свае [illegible] генаральскія войкі, імкнучы [illegible] ці ўдар працёўніка [illegible] войскі і захаваць у цэласьці [illegible] Часныя. Абарона Жэхэ, гарысон [illegible], якую можна было доўгатрымліваць, была, ня гледзячы на [illegible] ваколі не шум, прадана слабым мясцовым сілам, якія [illegible] разьбегліся, часткова пера[illegible] на бок працёўніка. У розуль[illegible] вялікарная правінцыя была за[illegible] японцамі ў парадку ваеннай пра[illegible] на пропіну яўіх-небудзь 20 [illegible]

[illegible] абарону Жэхэ выклікаў та[illegible] ў грамадзкай думцы Кі[illegible] Нанкіну давялося ахіяраваць [illegible] самаабарону і агору ў паўночным Кітаі — Чжан Сюэ-Ляна, [illegible] быў найсьці ў адстаўку і [illegible] занезку. Але ваенная кампанія [illegible] пасьля гэтага [illegible] Паўночным Кітаі — на тэрыторыі правінцыі Хобэй — паказала, [illegible] ўрад вядзе вітаральна [illegible] самую палітыку «абатажу і [illegible] Чжан Сюэ-Ляна. Наперакор усёй балбатні аб вайне да пераможнага канца, Нанкін абмяжоўваў свае намаганьні тым, каб падстаўляць японцам войскі непадзейных або варожых яму генералаў; гэтым войскам не пасылалася ні падмацаваньняў, ні грапо[illegible] ні нават зброі. І няма нічога дзіўнага, што пасьля невялікага затрыманьня ў праходах Вялікай сьцяны (якая прадстаўляе сабой нешта на[illegible] крэпасьці і ў іншых умовах магла-б быць узята японцамі толькі з вялікімі ахвярамі) кітайская армія пачала адкочвацца назад, а японская прасоўвацца ўперад амаль з такой-жа шпаркасьцю, як пры заняцьці японцамі Жэхэ. Пасьля аддачы праходаў у Вялікай сьцяне кітайскія войскі, асабліва па крайнім, усходнім вучастку фронту, дзе наступленьне японцаў вялося ад Шанхай-Гуаню, амаль пераставалі аказваць якое-б там ні было супраціўленьне і несьлі вялікія страты толькі таму, што як-бы шпарка яны ні ўцякалі, японская авіяцыя прасоўвалася яшчэ шпарчэй.

З гэтай вайны ў Паўночным Кітаі кітайская рэакцыя выйшла з новым, яшчэ больш пякучым кляймом здрадніцтва і банкрутства. Ганебная кампанія ў Паўночным Кітаі атрымала такое-ж ганебнае завяршэньне ў капітуляцыкай здзелцы, падпісанай 31-га мая.

Здзелка гэта заключалася ў глыбокай тайне і ўмовы яе поўнасьцю невідавочна, і дагэтуль застаюцца невядомымі. З таго, што было апублікавана, відаць, што кітайскія войскі абавязваліся адступіць на поўную лінію, якая ідзе на паўднёвы-ўсход ад Пэкіну, аб пераходзіць гэтай лініі і «ўстрымліваць», тады як японскі бок, у выдзеньлі, тады як японскі бок, у выпадку выкананьня кітайцам гэтых умоў, абяцаў адвесьці свае войскі за Вялікай сьцяны з тым, каб ўвесь раён паміж разьмежаньнем кітайскіх войск і гэтай сьцяной застаецца «нейтральнай зонай», куды кітайскай арміі ўваход заборонен. Характэрна, што ў кітайскіх паведамленьнях, на якіх аспоўвалася і савецкая прэса, згода выглядала так, быццам японцы абяцалі адвесьці ўсе свае войскі, тады як у тэксьце згоды, якая была апублікавана японскімі ваеннымі ўладамі ў Токіо (Японія, зразумела, яны толькі і будуць кіраваць) гаворыцца толькі аб адводзе «большай часткі» японскіх войск. У астатнім, значыцца, «нейтральная зона» застаецца ў сфэры японскай акупацыі. Да таго-ж, побач з регулярнай японскай арміяй у гэтай зоне знаходзяцца таксама «манчжурскія войскі», якія складаюцца або цалкам з тых-жа японцаў, або з манчжурскага зброду пад камандай японскіх афіцэраў і унтэр-афіцэраў. Аб гэтых войсках у згодзе нічога не гаворыцца — яны, такім чынам, захоўваюць поўную свабоду дзеяньняў. Да гэтага трэба дадаць, што хоць згода не прадугледжвае акупацыі японскімі войскамі Пэкіну і Цзяньцзіну, але гэта пытаньне на практыцы ўрэгулявана на поўнае задавальненьне японцаў, паяўнасьцю ў гэтых гарадох японскіх гарнізонаў, атрымаўных незадоўга да заключэньня перамір'я буйныя падмацаваньні. Зразумела, зусім прадуманадобна, што да гэтых пунктаў даданы і другія, яшчэ больш капітуляцыйныя і таму застаўшыяся ў сакроце (Японскі міністар, генэрал Араакі, хутка пасьля падпісаньня перамір'я, заявіў, што выкананьне японскага аб'яўлёў аб адводзе войск будзе пацаньня **скага байкоту).** Але і ў сваім апублікаваным выказдзе яна (згода) прадстаўляе сабой лепшы ня самую ганебную старонку ў гісторыі кітайскай капір-рэакцыі і ў гісторыі пакінскага здрадніцтва японцам двух год.

Няма патрэбы даказваць, што падпісаньне гэтай згоды зусім не азначае адмаўленьня японскага імпэрыялізму ад далейшай агрэсіі ва ўласным Кітаі, які ўсё яшчэ застаецца аб'ектам японскіх гарачых жаданьняў. Пры нынешнім ваенным дзеяньні ў раёне Пэкіну азначае толькі, па-першае, што японскі імпэрыялізм атрымлівае свабоду рук для тым больш энэргічнага далейшага наступленьня ўглыб унутранай Манголіі, якая зьяўляецца ўжо ня аднаго, а другое, што ў Паўночным Кітаі створаны ўжо неабходныя прадпасылкі для разгортваньня японскіх палітычных інтрыг, мэтай якіх зьяўляецца «манчжурызацыя» ўсяго басэйну Жоўтай рэкі.

Японская армія, прасоўваючыся да Пэкіну, мела ў сваім абозе гатовы «ўрад Паўночнага Кітаю» з японскіх платных агентаў. У сярэдзіне мая ў горадзе Цзяньцзіне ўжо была зроблена спроба палітычнага перавароту, на падабенства тай, якая адбылася там у лістападзе 1931 г.: у казармах японскіх салдат на так званай японскай канцэсіі (частка горану, у якой поўнасьцю гаспадарыць японцы), былі сабраны «паўстанцы», лікам каля 3 тысяч чалавек, якія адтуль і былі выпушчаны на кітайскую тэрыторыю, але разьбегліся, спаткаўшы моцны атрад кітайскай паліцыі. Японскія інтрыгі знаходзяць яшчэ больш яркае выяўленьне ў новым абвастрэньні генэральскай сяклокі, якая мае месца ў Паўночным Кітаі за апошнія тыдні і прывяла ўжо да выступленьня генэрала Фын Ю-Сяна ў правінцыі Чахар.

У Паўночным Кітаі фэадальны мілітарызм квітнее ў найбольш прымітыўных яго формах. Тэрыторыя паўночных правінцый распадаецца на мноства вотчын вялікіх і малых мілітарыстаў, якія вядуць адзін з другім барацьбу за тэрыторыі і даходы.

Правесьнікам новай генэральскай бойкі буйнога маштабу зьявілася ўзброеная сутычка, якая адбылася ў Шандуні ў кастрычніку мінулага году. Найбольш актыўнай сілай у антыпакінскім лягеры на поўначы заставаўся Фын-Ю-Сян, па-ранейшаму зашэрты з рэшткамі сваіх войск у бедных і гарыстых глыбінных раёнах і адрэзаны ад морскага ўзьбярэжжа. Фын-Ю-Сян стаў адпаведна важным пунктам прыкладаньня для японскай палітычнай інтрыгі. Пакуль ішла вайна ў Жэхэ і Паўночным Кітаі, Фын-Ю-Сян заставаўся ў баку, але дэманстратыўна выкарыстоўваў абурэньне мас здрадніцтвам Нанкіну і вёў адпаведную «патрыётычную» кампанію, патрабуючы, напрыклад, мабілізацыі і адпраўленьня на фронт супроць японцаў 80 проц. усіх армій, якія існуюць дзе-небудзь у Кітаі, і г. д. Паняродадні фармальнага заключэньня перамір'я, Фын Ю-Сян выступіў адкрыта, зрабіў перавярот у Калгане, захапіў сваімі войскамі стратэгічныя пункты паміж Калганам і Пэкінам і абвясьціў, што ён прымае на сябе галоўнае камандаваньне ў мэтах бязьлітаснай вайны з Японіяй. У сапраўднасьці-ж Фын-Ю-Сян імкнецца, зразумела, не да аказаньня сапраўднага супраціўленьня японцам, што для яго і недаступна з прычыны слабасьці і дрэннай узброенасьці яго арміі,—а толькі да таго, каб захапіць новыя тэрыторыі і даходы. Гэта выступленьне поўнасьцю адпавядае японскім плянам, бо яно, па-першае, можа стварыць новыя повады для японскай інтэрвэнцыі, па-другое, зьяўляецца як-ніяк сакратарыцкім рухам, які супрацьпастаўляе Паўночны Кітай Цэнтральнаму, што знаходзіцца пад уладай Нанкіну, а, па-трэцяе, прыводзіць да выгодных для Японіі зрухаў у суадносінах сіл у лягеры паўночна-кітайскай рэакцыі.

Няма нічога дзіўнага, што японская прэса адназлася да выступленьня Фын-Ю-Сяна досыць роўнадушна, а японскія ваенныя ўлады намякнулі на ват, што гэта выступленьне можа прывесьці да ўлады ды прабавання японскага агента Дуан-Ці-Жуя, урад якога навінен стаць мостам да стварэньня ў Паўночным Кітаі другой Манчжурыі.

Выступленьне Фына і абвастрэньне становішча ў Паўночным Кітаі самі па сабе сьведчаць аб далейшым паглыбленьні крызісу, які перажывае кітайская гаміндапаўская рэакцыя, у значнай меры іменна ў сувязі з яе самавыкрыцьцём у справе абароны Жэхэ і Хобэю.

Другім фокусам у разьвіцьці гэтага крызісу зьяўляецца ўсё большае абвастрэньне канфлікту паміж Нанкінам і Кантонам, дзе фактычна існуе ўжо не залежны ад Нанкіну ўрад, які пашырае сваю ўладу на пяць паўднёвых правінцый Кітаю. Кантон выкрываючы капітуляцыю Нанкіну ў Паўночным Кітаі і ўсяляк стараецца нажыць на гэтай справе палітычны капітал. У сярэдзіне мая кантонская ўлада дэманстрацыйна абвясьціла аб пасылцы ёю на поўнач ваенцай эскэдрыльі для барацьбы з Японіяй. У сапраўднасьці, вядома, гэта армія прызначаецца зусім ня супроць японцаў. Зьбіраньне яе зьяўляецца падрыхтоўкай да ўзброенай сутычкі з Нанкінам. Па сьведчаньні вядомага цьвёрдалобага ангельскага журналіста Вудхэда ў газэце «Шанхай Івнінгпост», паступленьне адкрытага канфлікту паміж Кантонам і Нанкінам «ёсьць толькі пытаньне часу і прытым пядоўгага».

Вайна і капітуляцыйнае перамір'е ў Паўночным Кітаі паскараюць разьвіцьцё міжусобных канфліктаў у лягеры кітайскай рэакцыі. Яны пяўхільна прыводзяць і да ўзмацненьня рэвалюцыйнай барацьбы, якую кітайскія рабочыя і сяляне вядуць пад кіраўніцтвам гераічнай кітайскай кампартыі.

Імпэрыялістычная прэса ўсіх нацыянальнасьцяй недарма зноў забіла трывогу з повазу нарастаньня рэвалюцыйнай патрозы ў Кітаі. Савецкі Кітай, які застаецца непераможным, ня гледзячы на ўсе намаганьні гаміндапаўскай рэакцыі, падтрыманай імпэрыялістамі, атрымаў за апошнія месяцы рад новых перамог. У цэнтральным савецкім раёне, у правінцыі Цзяньсі, Чырвоная армія разграміла адну за другую пекалькі дывізій працёўніка, прычым загінулі два белыя дывізійныя генэралы, і захапіла вялізарную колькасьць зброі. У правінцыі Сычуань утварыўся новы буйны сав

ФАШЫСЦКІМ ТЭРОРАМ НЯ СПЫНІЦЬ НАДЫХОДЗЯЧАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

КПГ у барацьбе з фашызмам

Па меры наближэньня працэсу аб падпале рэйхстагу, у якім т. т. ТОРГЛЕР, ДЗІМІТРАЎ, ТАНЕЎ і ПАПОУ прадстануць, як «зьняволеныя грамадзянскага закону», у Германіі ўзмацняюцца пратэсты рэвалюцыйных рабочых.

Нацыянал-сацыялісцкая прэса вымушана прызнаць, што камуністамі праяўлена вялізарная актыўнасьць, ня гледзячы на зробленыя арышты. Камуністы бясконца пашыраюць адозвы, заклікаючыя да барацьбы супроць фашызму, за вызваленьне арыштаваных таварышоў.

«АНГРЫФ» друкуе сёньня «поўны абурэньня» пратэст супроць «грамадзян, дапускаючых, каб камуністамі на вуліцах сталіцы расклейваліся антыфашысцкія плякаты і лятучкі».

У працягу апошніх дзён атрады штурмавікоў і гітлераўскай паліцыі па часьцілі свае рэйды ў рабочыя раёны, дзе кампартыя і МОПР праявілі найбольш актыўную работу.

(Уласн. інфарм.).

Арышт былога старшыні рэйхстагу с.-д. Лебэ

БЭРЛІН, 25 (ТАСС). Арыштован былы старшыня рэйхстагу сацыял-дэмакрат **Лебэ** і рад іншых відных сацыял-дэмакратаў.

Рабочая дэманстрацыя ў Бэрліне

Ва ўсходняй частцы БЭРЛІНУ рэвалюцыйнымі рабочымі была арганізава на дэманстрацыя, у якой прынялі ўдзел каля 600 чалавек. Са сьпевам «Інтэрнацыянэлу» дэманстрацыя прайшла тры вуліцы. Удзельнікі дэманстрацыі крычалі: «НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМПАРТЫЯ!» «ДАЛОЎ РЭЖЫМ ГІТЛЕРА!», «ВЫЗВАЛЬЦЕ ТОРГЛЕРА!».

Атрады фашысцкіх штурмавікоў дарэмна стараліся расьсеяць дэманстрантаў.

Дасягнуўшы сваёй мэты, рабочыя пачалі рэзыходзіцца. Поўная ярасьці паліцыя арыштавала «на ўдачу» 30 чалавек з трапіўшых пад руку прахожых.

(Уласн. інфармацыя).

Лэдзі Астор патрабуе скасаваньня эмбарго

ЛЁНДАН, 25. (ТАСС). Кансэрватар лэдзі **Астор** у палаце абшчын заявіла, што час ангельскаму ўраду «зьлезьці з каня» і прадпрыняць што небудзь у адносінах эмбарго на савецкія тавары. Заява лэдзі Астор характарызуе несдавальненьне дзелавых колаў эмбарго і іх непакойства з прычыны захопу іншымі эўрапэйскімі краінамі гандлю з СССР.

Магутныя антыфашысцкія дэманстрацыі ў Н'ю-Ёрку

ЛЁНДАН, 24 (Белта). 20 тысяч чалавек прымала ўдзел у дэманстрацыі антыфашысцкага адзінага фронту ў Н'Ю-ЁРКУ пад лёзунгамі барацьбы супроць германскага фашызму, супроць «закону аб аднаўленьні прамысловасьці» у ПАЗШ, супроць імпэрыялістычных пагроз Савецкаму Саюзу, Восем тысяч чалавек дэманстравалі на «ЮНЬОН СКВОЙР», дзе тысячы гледачоў сустракалі апладысмэнтамі аратараў, якія заклікалі да барацьбы супроць фашызму і да абароны СССР. У дэманстрацыях прымалі ўдзел камуністычныя, рэвалюцыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, культурныя таварыствы, група адзінага фронту, германскія і італьянскія антыфашысцкія арганізацыі. Амэрыканскія сацыялісты афіцыяльна ня прымалі ўдзелу, але адзін з рэфармісцкіх правадыроў МУСТЭ выступаў з прамовою.

Германская кампанія за раўнапраў'е ва ўзбраеньнях

Інсцэніроўка налёту „замежных" аэраплянаў на Бэрлін

БЭРЛІН, 25 (ТАСС). Агенцтва «Вольфа» паведамляе, што над Бэрлінам праляцелі «прыбыўшыя з-за мяжы» самалёты, якія кідалі антыўрадавыя лістоўкі над кварталам урадавых будынкаў і над рабочымі раёнамі ва ўсходняй частцы гораду. Увесь друк пасьпешна ўхапіўся за гэта паведамленьне і, падкрэсьліваючы паветраную безабаронасьць Германіі, патрабуе роўнапраўя з вялікімі дзяржавамі ў паветраных узбраеньнях. Нац.-сацыялісцкі афіцыёз **«Фолькішэр Бэобахтэр»**, заяўляючы, што самалёты раскідвалі «марксысцкую паклёпніцкую літаратуру», піша: «Патрабуем неадкладных абаронных мерапрыемстваў супроць чырвонай паветранай чумы». Орган «Сталёвага шлему» **«Крэйц Цэйтунг»** таксама заяўляе: «Ці зразумеюць у Жэнэве і Лёндане, што Германія стаіць на фарпостах цывілізаванага сьвету і што яна на можа ўтрымаць гэтага паста, калі ёй ня будзе прадастаўлена роўнасьць ва ўзбраеньнях з другімі нацыямі».

***

ВЕНА, 25 (ТАСС). Над **Лінцам** зьявіўся германскі самалёт, які сьпіхнуў лістоўкі, заклікаючыя да зьвяржэньня ўраду **Дольфуса.** Лістоўкі пад пісаны ўцёкшым у Германію кіраўніком аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў **Прокшам.**

***

Інсцэніроўка налёту «замежных» самалётаў на Бэрлін і інсцэніяваная ў сувязі з гэтым кампанія друку — новы трук фашысцкай дыктатуры, маючы мэту апраўдаць правадзімыя яўна і патаемна ўзбраеньні. Не падлягае ніякаму сумненьню, што «налёт» быў падрыхтован і праведзен кіруемым ГЕРЫНГАМ міністэрствам авіяцыі. «Налёт» на Бэрлін павінен быў прыцягнуць увагу да пытаньняў узмацненьня германскай авіяцыі і прадэманстраваць таксама тое, што ўжо ёсьць, а іменна — новыя тыпы самалётаў, якія міністэрства авіяцыі пасьпела ўжо вырабіць на заводах «ЮНКЕРСА» ў Дэсаў і «ФОКЕРА» ў Галяндыі. Калі міністэрства прапаганды ГЕБЕЛЬСА ў інсцэніяваных паведамленьнях гаворыць аб «невядомых» тыпах самалётаў, дык міністру авіяцыі Герынгу яны добра вядомы.

Паветраная дэманстрацыя не абмежавалася, між іншым, толькі адным Бэрлінам. Частка германскіх самалётаў зрабіла і палёты над Аўстрыяй.

(«Правда»).

Паветраны налёт на Бэрлін--выдумка нац.-сацыялістаў

ЛЁНДАН, 25 (ТАСС). Германскае паведамленьне аб зьяўленьні замежнага аэраплану над Бэрлінам сустрэчана друкам гіранічна. **«Дэйлі Геральд»** адкрыта заяўляе, што «паветраны налёт» выдуман нацыянал-сацыялістамі і выкарыстаны ў мэтах прапаганды.

„Налёт адбыўся надзвычай сваячасова"

ЛЁНДАН, 25 (Белта). Друк па-рознаму ацэньвае гіранічныя водгукі на германскае паведамленьне аб «паветраным налёце» на Бэрлін.

Карэспандэнт «Сэндэй Таймс» указвае, што налёт адбыўся надзвычай сваячасова, г. зн. праз 24 гадзіны пасьля таго, як пачаўся германскі авіяцыйны тыдзень.

Бэрлінскі карэспандэнт «Рэйтэр» зьвяртае ўвагу на тое, што налёт адбыўся як раз у момант, калі ўсе замежныя журналісты слухалі даклад Розэнбэрга ў закрытым памяшканьні і такім чынам не маглі нічога ўбачыць.

Бэрлінскі карэспандэнт «Дэйлі Экспрэс» заяўляе, што ўся справа зводзіцца да грубай інсцэніроўкі. Ён лічыць, што Германія ўчора парушыла вэрсальскі дагавор, калі Герынг разьмясьціў заказы на 2 хуткалётных аэраплянны для «паліцэйскіх патрэб».

«Сэндэй Дыспэтч» заяўляе, што Германія цяпер будзе патрабаваць у Жэнэве раўнапраўя ва ўзбраеньнях у паветры таксама як і на сушы.

***

ПАРЫЖ, 25 (Белта). Французкі друк аднадушна расцэньвае паведамленьне аб паветраным налёце на Бэрлін, як правакацыйны выбрык германскага ўраду, які мае на мэце адмацаваць германскія патрабаваньні аб праве на ўласную ваенную авіяцыю.

«Журналь», падкрэсьлівае, што паведамленьне аб налёце на Бэрлін заключае ў сябе ўсе элемэнты ашуканства». Чым тлумачыць, пытаецца газэта, што паведамленьне агенцтва «Конці» аб паветраным налёце было атрымана газэтамі за 20 мінут раней таго, як жыхары **Бэрліну** заўважылі самалёты над гарадам? У момант, калі зноў павінна сабрацца канфэрэнцыя па раззбраеньні, — піша «Журналь», — Германія, якая абвінавачваецца ў тым, што яна патаемна ўзбройваецца, хацела паказаць, што яе бясьпечнасьць знаходзіцца пад пагрозай. Таямнічы налёт, устрывожаная грамадзкая думка—якая бліскучая тэма для прамовы **Надольнага.** Але зарад прападае даремна, інсцэніроўка нападаў — звычайная дымлёматычная зброя Германіі».

«Эр Нувэль» проста заяўляе, што самалёт, сапраўды лятаўшы над Бэрлінам — родны брат таго самалёта, які скідаў учора над **Венай** нацыянал-сацыялісцкія лістоўкі.

З лёнданскай канфэрэнцыі

Япона-германская вылазка супроць СССР

ЛЁНДАН, 24 (Белта). Учора адбылося закрытае пасяджэньне створанай пры жэнэўскай камісіі падкамісіі па пытаньнях найбольшага спрыяльня. Японскі прадстаўнік задаў пытаньне: «Ці ўваходзіць у кампэтэнцыю названай падкамісіі абмеркаваньне пытаньняў аб мэтадах ужываемых краінай, якую ён ня зьбіраецца называць, самая сыстэма якой становіць сабою форму дзяржаўнага субсыдыраваньня прамысловасьці?» Германскі прадстаўнік **Поссэ** выказаў японцу падзяку за сваячасовую пастаноўку пытаньня аб анамальнай дзяржаве, якая ўсім добра вядома. Ён указаў, што справа ідзе аб краіне, дзе ўся прамысловасьць і гандаль знаходзяцца пад дзяржаўным кантролем. Паводле слоў Поссэ можна сумнявацца, каб з такой краінай можна было-б заключаць якія небудзь згоды аб найбольшым спрыяньні ці аб мытных тарыфах. Капіталістычным краінам цяжка дагаварыцца паміж сабою аб скасаваньні дзяржаўных субсыдый, паколькі незадома, як будзе дзейнічаць у далейшым краіна, дзе дзяржава ахапляе ўсе віды народнай гаспадаркі.

Старшыня падкамісіі (ангелец) выказаў падзяку Поссэ за ясную пастаноўку пытаньня аб анамальнай краіне. Ён указаў, што пытаньне аб гэтай дзяржаве стаіць асобна.

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Заявы Розэнбэрга на прыёме замежных журналістаў

БЭРЛІН, 24 (БЕЛТА). Учора зьнешня-палітычны аддзел нацыяналісцкай партыі паладзіў прыём прадстаўнікоў замежнага друку. На прыёме выступіў Розэнбэрг. Па пытаньні аб заброне сацыял-дэмакратычнай партыі, Розэнбэрг заявіў, што гэта «гістарычны факт, які завяршае 70-гадовы перыяд разьвіцьця Германіі». Розэнбэрг вымушан быў прызнаць, што ў сучасны момант зьнешня-палітычнае становішча Германіі неспрыяльнае. У заключэньне Розэнбэрг заявіў: «таксама як Германія адхіляе ўсякае ўмяшаньне ў свае справы, яна ня мае намеру ўмешвацца ва ўнутраныя справы іншых краін».

СЕНЬНЯ, а 5 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ

скліканае

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

з наступным парадкам дня:

1. Канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні ўборачнай і загатоўчай кампаніі (дакл. тав. **КУДЗЕЛЬКА**).
2. Практычныя мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце палітаддзелаў, калгаснай ячэйцы і ўзаемадносінах паміж райкомамі і палітаддзеламі (дакл. тав. **ГЕРШОН**).
3. Ход будаўніцтва па гораду і раёну (даклад. тав. **КАВАЛЁЎ**).

Члены ЦК, ЦКК, ГК і ГКК КП(б)Б праходзяць па сваіх мандатах.

Сакратары парткалектываў і ячэек КП(б)Б атрымліваюць білеты ў Менгаркоме КП(б)Б 25-VI—33 г. пакой 45.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б КУДЗЕЛЬКА.

Рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА"

скліча

на **28 чэрвеня** ў 7 гадзін вечара

НАРАДУ ПА ДАРОЖНАМУ БУДАЎНІЦТВУ.

На нараду навінны зьявіцца т.т. **Фрункін, Гольдштэйн, Грознар, Хайкін, Нароў, Гохфэльд, Гольдзін, Фурман, Дубгавой, Тарасевіч,** (Галоўдартранс), **Расэўскі, Юнкур** (Нарадкамзем); **Сьміронаў, Казлоў** (Упраўдарканцтрасаў); **Селіванаў, Адашчык** (Льнетрактарабэтэр); **Сарокін** (Збожжатрактарабэтэр); **Грабенчык** (Бульбагародні трактарабэтэр); **Дзікчык** (ЦС Аўтадору); **Лубянскі** (ЦК ЛКСМБ); **Турненіч** (дарэсэкцыя БКС); **Адам** (ЦСПСБ); **Сьцяпанаў** (Меммалірамтрэст); **Аўчыньнікоў** (Сьвіназодтрэст); **Плікус** (ЦП шофэраў); **Гольдзін** (ЦП дарожнікаў).

Запрашаюцца таксама прадстаўнікі транспартнага сэктару ЦК КП(б)Б, транспартная група ЦКК КП(б)Б і ўсіх цэнтральных газэт.

Крута ўзьняць тэмпы дарожнага будаўніцтва!

АЎТАДОР—У ПЕРАДАВЫЯ РАДЫ

Усім вядома, што па добрай дарозе лягчэйшы ня толькі аўтамабілю, трактару і камбайну, але і каню. Па добрай дарозе больш перавязеш грузу, больш будуць служыць аўтамабільныя рэсоры, шыны, конская збруя, калёсы і інш.

Ліквідацыя бездарожжа на вёсцы магчыма толькі пры ўмове масавага ўдзелу працоўных сельскіх мясцовасьцяй у дарожным будаўніцтве. Аўтадор павінен заняць у гэтай справе адно з перадавых месц.

Што мы маем на сёньняшні дзень? Факты сьведчаць аб тым, што толькі адзінкі аўтадораўскіх арганізацый пачалі разгортваць гэту работу.

Полацкі райсавет Аўтадору абавязаўся адпрацаваць на дарогах сіламі Аўтадору 10.000 працадзён, аправа шасьці дзён на кожнага працоўнага сельскай мясцовасьці, устаноўленых урадам БССР. Арганізуецца 6 брыгад аўтадоўцаў для работы на дарозе Бабінічы і калгасу «Аўтадор».

У **Жыткавіцкім** раёне праведзен нядзельнік па рамонце пад'ездаў, у якім прымала ўдзел 219 фурманак і даны 183 працадні. Сіламі ячэек Аўтадору будуецца мост 9 пагонных мэтраў.

У **Гомелі** ячэйка Аўтадору пры заводзе «Рухавік рэвалюцыі» распачала ўпарадкаваньне пад'езнага шляху да сваёй прыгараднай гаспадаркі.

Па ініцыятыве **Пухавіцкага** райсавету Аўтадору праведзен суботнік у саўгасе «Залог пяцігодкі», на якім працавалі тры трактары, адна аўтамашына, 25 фурманак і 150 чалавек. Менскім Гарсаветам Аўтадору сумесна з агітмасам ГК КП(б)Б арганізавана агітбрыгада з 10 чалавек, якая забясьпечана кіно-перасоўкай і находнай друкарняй. Выпускаюцца бюлетэні на дарвучастку.

Клімавіцкі райсавет Аўтадору выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва па ўдзеле ў дарбудаўніцтве Касьцюковіцкі райсавет. Для стымуляваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод аўтадоўцаў і працоўных мас створан прэміяльны фонд.

Побач з гэтым большасьць райсаветаў Аўтадору апартуністычна адносіцца да важнейшай справы дарожнага будаўніцтва. У **Лоеўскім** раёне, дзе плян па дарбудаўніцтве выкананы толькі на 52 проц., райсавет пальцам аб палец ня ўдарыў, каб што-небудзь зрабіць у гэтым пытаньні. Тое-ж хамае адносіцца і да **Рэчыцкага, Крычаўскага, Касьцюковіцкага** і **Аршанскага** райсаветаў. **Бярэзінскі** райсавет Аўтадору стаў на шлях «очковтирательства». Ён піша, што кампанія па правядзеньні месячніка барацьбы з бездарожжам у раёне ўжо праводзіцца і плян выкананы на 25 проц. у той час, калі гэты раён плян сёй выканаў толькі на 11 проц.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб кожны калектыў, ячэйка і аўтадоўвец сапраўды па-бальшавіцку ўзяліся самі за практычны ўдзел і шырока разгарнулі агітмасавую работу сярод працоўных мас гораду і вёскі на выкананьне пастановы ЦВК БССР аб абязлюдным працоўным удзеле насельніцтва ў дарбудаўніцтве.

ЦС Аўтадору будзе расцэньваць працадзольнасьць калектыву, ячэйкі і райсавету Аўтадору па ступені ўдзелу у дарбудаўніцтве. Кожны калектыў і ячэйка Аўтадору павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль ня менш, як свой ненасрэдны кантроль ня менш, як 5 клм. дарогі. Кожны член Аўтадору ў 6-ці дзён, яшчэ тры дні, упягнуць ня менш, як 3 чалавекі ў гэту справу і адрамантаваць ня менш 10 мэтраў дарогі. Аўтадор БССР павінен даць мінімум 100.000 працадзён дарбудаўніцтву.

Вельмі адказная задача ўскладаецца на калектывы і ячэйкі Аўтадору ў сельскай мясцовасьці. Ад Аўтадору патрабуецца непасрэдная дапамога будаўніцтву дарог унутры калгаснага і ўнутрысаўгаснага значэньня, будаўніцтву трысаўгаснага значэньня, будаўніцтву пад'езных шляхоў да МТС, збожжасховаў і да заводаў будматар'ялаў. Там асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на ячэйкі пры МТС, МТМ, саўгасах і калгасах. На жаль, ахоп членаў Аўтадору ў сельскай мясцовасьці нязначны.

У парадку шэфства вытворчыя калектывы Аўтадору павінны дапамагчы вясковым. Абвешчаны конкурс ЦС разам з Галоўдартрансам і ЦСПСБ на лепшае правядзеньне дарожна-будаўнічых работ сэзону 1933 году ўскладае вялікую адказнасьць на гарадзкія і раённыя саветы і калектывы Аўтадору.

Лепшая дапамога дарожным органам —стварэньне аўтадораўскіх брыгад, пастоў, арганізацыя суботнікаў дапамогі дарбудаўніцтву, арганізацыя аховы дарог і дарожнага будаўніцтва, шэфства аўтадораўскіх арганізацый над мастамі і асобнымі кілёмэтрамі дарог, дрэвананасджэньне на дарогах і інш.

Зараз самы разгар дарожнага будаўніцтва—Аўтадор тварам да дарогі!

(Нам. старшыні ЦС Аўтадору БССР)

Акінчык.

У Дзяржынску месячніка не пачалі

Дакладная пастанова ЦК і СНК па дарбудаўніцтве да сьвідомасьці работнікаў Дзяржынскага раёну не дайшла. Справа скарыстаньня працоўнага ўдзелу пушчана на самацёк. Месячнік штурму на раёне не абвешчан. Штабу кіраўніцтва дарбудаўніцтвам няма. У выніку—выходзіць усяго некалькі дзесяткаў падвод замест 800.

Нам. сакратара РК КП(б)Б гаворыць, што ён нічога ня ведаў аб неабходнасьці абвяшчэньня месячніка штурму. Старшыня РВК тав. **Вансоўскі** заяўляе, што месячнік штурму, «здаецца», абвясьцілі, але, на жаль, па дасадньнаму недагляду ні ў адну пастанову РВК гэта не ўвашло.

Бастурботнасьць начальніка дараддзелу тав. **Галавейчыка** няма межаў. Ён, ажаўваецца, меў ня раз гутаркі са старшынёй РВК аб дарожным будаўніцтве, але, на жаль, ніякага ўшлыву на выхад падвод гэта ня мела. Да 20 чэрвеня, дзенныя заданьні сельсаветам ня спушчаны.

Тэхнічнага кіраўніцтва будаўніцтвам няма ніякага. Асноўны мэтад «пабудовы» дарог гэта завалка калдобін і лажыньн на дарозе гальлём і лапкамі, а зьверху чорназёмам і дзірваном з каналаў. Тэхнік тав. **Гайдэка**, прыгрэты раёнам лятун, працкатыкуецца ў верхавой язьдзе, а не займаецца сваёй оправай.

Усё гэта мае адпаведны адбітак у сельсаветах. Негарэльскі сельсавет данае яму райвыканкомам заданьне па вывазцы гравія знашоў непасільным і зьнізіў яго самавольна.

Дарожных ўпаўнаважаных па большасьці сельсаветаў ня існуе. Дарожныя арганізатары па тры месяцы не атрымліваюць зарплаты.

Усё гэта гаворыць аб поўным ігнараваньні пастановы ЦК і СНК аб дарбудаўніцтве.

Сакратар РК ЛКСМБ заявіў начальніку дар. аддзелу: «Камсамолу і без гэтага работы даволі: ні яйкі нарыхтоўвай і малако нарыхтоўвай, дзе-ж нам дарогай займацца?» Барацьба за добрую дарогу, бачыце, ніжэй яго гонару.

Раён ганебна і злачынна правальвае плян. Неабходна стварыць рашучы пералом у рабоце і пераключыць максымум сіл на выкананьне пляну дарожнага будаўніцтва.

Галоўдартрансу трэба неадкладна зрабіць адпаведныя вывады адносна кіраўніцтва дарожнага аддзелу.

А. Ф-н.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Сарціроўка лесу на ст. Бярэзіна (Бабруйск).

Усебеларускае воднае сьвята

ВСФК разгортвае падрыхтоўку да надыходзячага 24 ЛІПЕНЯ Ў ВІЦЕБСКУ ВЯЛІКАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВОДНАГА СПАРТЫЎНАГА СЬВЯТА.

Воднае сьвята ставіць перад сабой мэтай папулярызаваць сярод шырокіх працоўных мас пэрспэктывы воднага спорту, агляд работы фізкультурных калектываў у разгортваньні летняй вучобы і выкананьні лічбаў па здачы норм «ГПА», мабілізацыя фізкультурных мас на яшчэ большае замацаваньне сацыялістычных мэтадаў работы і ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны і выяўленьне лепшых дасягненьняў па асобных відах воднага спорту.

У ВОДНЫМ СЬВЯЦЕ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ КАЛЯ 200 ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ—ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ-ЗНАЧКОЎЦАЎ, ЯКІЯ ЗЬЕДУЦЦА З 15 ГАРАДОЎ БССР.

Лепшыя калектывы выступяць з рапартамі аб сваёй рабоце і перададуць вопыт усім фізкультурнікам. Будуць праведзены спаборніцтвы па ПЛАВАНЬНІ, ГРЭБЛІ, НЫРАНЬНІ і СКАЧКОХ.

За пэрыяд з 1 па 15 ліпеня па раёнах будзе праводзіцца падрыхтоўчая работа і адбор на спаборніцтва лепшых каманд. Удзельнікам зможа быць толькі той, хто здаў норму на значок «ГПА» першай ступені. Каманды будуць складацца з 12 асоб—плаўцоў і грабцоў.

Для падрыхтоўкі сьвята пры ВСФКБ створана спартыўна-тэхнічная, арганізацыйна-гаспадарчая, агітмасавая і мэдычна-кантрольная камісіі.

Перадавікі спаборніцтваў атрымаюць дыплём ВСФКБ.

Новы парадак падрыхтоўкі асьпірантаў

СНК БССР вызначыў рад важных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы асьпірантаў. Падрыхтоўка будзе праводзіцца пры 20-ці навуковых і навучальных установах рэспубліканскага і саюзнага значэньня.

Кантынгент асьнянга прыёму асьпірантаў на 1933 год па БССР вызначан у 200 чалавек супроць 160 у 1932 годзе, у тым ліку для Акадэміі Навук 80 чалавек, для БДУ—13 чал., мэдінстытуту—20 і г. д.

На 1933 год устаноўлен дыфэрэнцыяваны разьмер стыпэндыі асьпірантам ад 175 р. да 300 р. у месяц.

Падрыхтоўчыя аддзяленьні асьпірантуры пры Беларускай Акадэміі навук, навукова-дасьледчым інстытуце прамысловасьці і калгасным інстытуце ліквідаваны.

Тэрмін вучобы вызначан у залежнасьці ад спэцыяльнасьці: для асьпірантаў літаратуры, мовазнаўства, права, гісторыі і філёзофіі—2 гады і 6 месяцаў, а для матэматыкаў, фізыкаў, геолёгаў, хэмікаў, біолёгаў, эканамістаў і інш.—3 гады.

Для кожнага асьпіранта абавязкова прадстаўленьне на працягу навучальнага году аднаго пісьмовага дакладу, ня менш двух выступленьняў, а таксама вывучэньне на працягу ўсяго вучобнага пэрыяду ня менш дзьвёх замежных моваў. Катэгарычна забараняецца асьпірантам сумяшчаць вучобу з якой-небудзь іншай работай.

Паляпшэньне жыльлёвых умоў навуковых работнікаў

Прэзыдыум ЦВК і СНК БССР прыняў пастанову, паводле якой навуковыя работнікі маюць права на дадатковы пасобны пакой для заняткаў, а калі такога няма—на дадатковую плошчу ў разьмеры ня менш 20 кв. мэтраў.

Жылая плошча, якая аслабяняецца навуковымі работнікамі, перадаецца ў распараджэньне камісіі садзейнасьці пры ўчоным пры СНК БССР або яе мясцовых органаў для засяленьня навуковымі работнікамі.

Гэта правіла не пашыраецца на дамы, пабудаваныя на падставе права за будоўлі, на дамы рабочых ЖБКТ, а таксама на тыя дамы прадпрыемстваў і устаноў, з якіх паводле спэцыяльных законаў дапускаецца высяленьне жыхароў, страціўшых сувязь з даным прадпрыемствам ці ўстановай.

Уся занятая навуковымі работнікамі жылая плошча, незалежна ад яе разьмераў, аплачваецца ў ардынарным разьмеры.

Пастанова прадугледжвае таксама льготы навуковым работнікам пры іх мандэтыроўках. За сям'ёй намёршага навуковага работніка права на ўсю ранейшую жылую плошчу захоўваецца на працягу трох месяцаў.

ЖБКТ навуковых работнікаў за ўсіх адносінах прыраўноўваюцца да ЖБКТ іншых работнікаў.

ХРОНІКА

*** За пяршынства ў конкурсе на лепшую песьню, прысьвечаную 1 мая, прысуджаны прэміі пісьменьнікам: Але ксандровічу і Дарожнаму і кампазытарам Іванову і Сакалоўскаму.**

*** Зборнік пад назвай «За сацыялістычную драматургію» выпускаецца аўтаномнай сэкцыяй драматургаў і кампазытараў пры саюзе савецкіх пісьменьнікаў. У зборніку будуць зьмешчаны адзінаўныя выступленьні, зробленыя драматургамі і пісьменьнікамі на Усебеларускай нарадзе, прысьвечанай драматургічнай творчасьці. Зборнік зарыхтуецца да друку.**

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АНТЫСАВЕЦКІЯ ПЛЯНЫ ГЕРМАНСКІХ ФАШЫСТАЎ І АНГЛІЙСКІХ ЦЬВЁРДАЛОБЫХ

ЛЁНДАН, 24 (Белта). У праекце Англа-германскай гандлёвай згоды, уручанай германскімі прадстаўнікамі ангельскаму ўраду, ёсьць апрача ўжо вядомага плану падзелу рынкаў паміж Англіяй і Германіяй, таксама і прапанова спэцыяльнай згоды адносна савецкага рынку. Поэт зьлёгкадзіць з таго, што ў недалёкім будучым можна чакаць у Савецкім саюзе такіх перамен, якія шырока адкрылі б савецкі рынак для замежных тавараў.

Вось чаму Германія ўжо загадзя прапануе Англіі дагаварыцца адносна ўстанаўленьня сфэр уплыву на гэтым будучым рынку. **Гугенбэргаўскі** мэмарандум меў на ўвазе імкнна гэтага роду магчымасьці ва Ўсходняй Эўропе. Пашчупваньне глебы ў мэтах палітычнага зблізэньня паміж Англіяй і Германіяй працягваецца з неаслабнай энэргіяй. У Лёндане ўжо больш двух тыдняў знаходзяцца два выдатных супрацоўнікі Розэнбэргаўскага зьнешня-палітычнага камісарыяту—**Бэнзн і д-р Шмідт.** Іх задачай зьяўляецца падрыхтоўка прыезду **Герынга** ў Лёндан на выпадак, калі прыезд Гітлера сустрэне вельмі вялікія перашкоды.

На **27 чэрвеня** склікаецца

зьезд гаррайздраваў і вучастковых дактароў

з наступным парадкам дня:

1. Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва і чарговыя задачы аховы здароўя і плян другой пяцігодкі.

Даклад. тав. **ШПЭКТАРАЎ.**

Садаклад тав. **ЛІЎШЫЦ.**

2. Санітарна-эпідэмічнае становішча і меры барацьбы з эпідэміяй.

Даклад тав. **НІСЕНБАУМ.**

На зьезд павінны прыбыць усе гаррайздравы, вучастковыя дактары, галоўдактары больніц і лепшыя дактары-ўдарнікі, згодна дасланых разьвёрстак райздравам.

Адкрыцьцё зьезду ў **7** гадзін вечара, у клюбе **мэталістаў** па Універсітэцкай вуліцы.

НАРКАМАХОВЫ ЗДАРОЎЯ.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ „САЮЗДРУКУ"

даводзіць да ведама,

што **ПРЫЁМ ПАДПІСКІ** на газэты

„ТРУД", „ЗА КОММУНИСТИЧЕСКОЕ ПРОСВЕЩЕНИЕ", „ЗЬВЯЗДА", „РАБОЧИЙ",

„ЧЫРВ. ЗЬМЕНА", „АКЦЯБРЬ", „ОРКА", „КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ"

працягнут да 30-га чэрвеня ўключна.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—на пошце (**Ленінская 34**, 2-гі паверх) з **9** гадзін раніцы да **9** гадзін увечары, і ўсімі лістаносцамі; на раёне—**усімі райбюро Саюздруку.**

САЮЗДРУК.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ

Беларускім аддзяленьнем ОГІЗ'а РСФСР

(Савецкая, 41, тэл. 23-709)

ПРАЦЯГНУТА ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЯ ПАДПІСЧЫКАЎ

на ўсе падпісныя выданьні ОГІЗ'а **да 1-га ліпеня г.г.**

Прапануецца ўсім падпісчыкам **зарэгістравацца**, а таксама атрымаць маючыяся тамы марксыцка-ленінскіх выданьняў, энцыклёпэдый і інш.

Падпісчыкі, якія не зарэгістраваліся і не атрымалі да 1-га ліпеня, тых тамоў, якія ёсьць, будуць лічыцца выбымушэні з ліку падпісчыкаў.

Беларускае Аддзяленьне ОГІЗ'а

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО **ОПТЭ** ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ

БЮРО ПАДАРОЖЖАЎ ЦС ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

ЎСЕ БАЗЫ БЮРО ЎНОЎ АДРАМАНТАВАНЫ

і забясьпечаны харчаваньнем.

ЗАПІСЬ НА МАРШРУТЫ Ў МЯСЦОВЫХ САВЕТАХ ОПТЭ.

ТОРГСІН

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ПАВЕДАМЛЯЕ КЛІЁНТУРУ, МАЮЧУЮ НА РУКАХ **таварныя ордэры Торгсіну (ТОТ),** што

АПОШНІ ТЭРМІН АБМЕНУ

НА ЗАБОРНЫЯ КНІЖКІ

вызначан **да 1-га ліпеня 1933 г.**

Абмен праводзіцца ва ўсіх універмагах Торгсіну як у Менску, так і ў іншых гарадох.

Пасьля вызначанага тэрміну таварныя ордэры Торгсіну (ТОТ)

БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЦА АНУЛЯВАНЫМІ.

„ТОРГСІН".

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г.	**ЗОНГ** КАХАНЬНЕ БЕДНАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ ў 2-х сэрыях, 10 частках
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **Мотэлэ Шпіндлер**
„ПРАЛЕТАРЫ"	Новы замежны фільм **ЖАНЧЫНА з ГОР**
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня.	Лепшы гукавы мастацкі фільм **ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ**
СПАРТАК Каса—з 3, 30 м.	ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ **ЧАС—ГРОШЫ** камэдыі ў 6 частках.

Будаўніцтва Быхаўскага ацэтонавага заводу

просіць былых і цяперашніх рабочых і служачых

атрымаць свае аблігацыі:

„5-годка—за чатыры гады", „3-ці рашаючы" і „4-ы завяршальны—

да 1-га ліпеня 1933 г.

Пасьля гэтага тэрміну аблігацыі будуць перададзены ў ашчадкасу ў абязьлічаным выглядзе.

Адміністрацыя.

Яўр. нарсуд г. Менску, на падставе ад 10-IV—33 г. на 195 арт. К. К. абвяшчае **гратадзкае геньбрэньне** працаўніку Лесазбыту

тав. Шапіра Іосіфу Нэвахаву

за тое, што ён, будучы адказным ад бюро ПР Лесазбыту па выдачы хлебных картак, выдаў гр. **Нунцвіну** на яго жонку хлебную картку, не патрабаваўшы ад яго даўнай кнігі, дзе было адзначана, што яна ўжо атрымала картку па месцы яе працы.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ **„СОЮЗОРГУЧЭТА"**

з 1-га чэрвеня г.г. арганізуе групу

СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ

ДЛЯ СЫСТЭМЫ

БЕЛПЛОДГАРОДНІНА

На курсы